№№177—178
(2697—2698)

8 лістапада 2007 г.
Выдаецца з ліпеня 1995 г.
на беларускай і рускай мовах

Выдавец:
УП «Народная воля».
Кошт — свабодны.

На прастор, на шырокі разлог
Выхадзі, мой народ, грамадою...
Якуб КОЛАС

Да ўвагі!

Хто не зрабіў перадаплату і хоча набываць газету ў офісе рэдакцыі — чакаем!

Шаноўныя чытачы!

Па пытаннях распаўсюджвання газеты жыхары сталіцы могуць звяртацца па тэлефоне 206-63-93, усе астатнія — па тэлефоне 206-68-71.

АКЦЫЯ

Лебедзь, рак і шчупак заклікалі на Марш...

І што выйшла?

4 лістапада, 12.00, іграе аркестр. Каля Акадэміі навук толькі невялікія купкі людзей — чалавек 100—200. Здаецца, што "Сацыяльны марш" так і не адбудзецца. Але паціху народ пачынае прыбываць. Тут і чарнобыльцы, тут і пенсіянеры, тут і тыя, хто безвынікова шукае справядлівасці ў судах, і тыя, хто шукае іншы шлях для сваёй краіны. Але людзей мала, для такога мерапрыемства — вельмі мала.

З самага пачатку арганізацыі Маршу нешта не задалося з яе падрыхтоўкай. Аляксандр Мілінкевіч без усялякіх тлумачэнняў адразу паведаміў, што не будзе займацца сацыяльнай акцыяй. Як потым высветлілася, у праеўрапейскіх апазіцыйных колах нават падвялі пад гэта ідэалагічную базу: маўляў, не трэба пакуль чапаць сацыяльныя праблемы, бо Лукашэнка пачынае эканамічныя рэформы, а рэформы — гэта заўсёды балюча для насельніцтва... Усё-ткі далёкія нашы палітыкі ад народа!

У выніку Аляксандр Мілінкевіч у дзень "Сацыяльнага маршу" накіраваўся ў Масты, Вінцук Вячорка — у Гродна, прыхільнікі Кансерватыўна-Хрысціянскай партыі — БНФ на чале з Юрасём Беленькім — да Лошыцкага яру, каб памянуць расстраляных тут ахвяр рэпрэсій, групу маладзёжных актывістаў (чалавек 60) павезлі на семінар у Вільнюс... У выніку "левыя сілы" змагаліся за сацыяльныя гарантыі для простага люду фактычна адзін на адзін. Праўда, пры падтрымцы актывістаў Аб'яднанай грамадзянскай партыі.

Даўно ўжо ў Мінску не было такой "рознакаляровай" акцыі. Тут і група на чале з генералам Валерыем Фраловым з расійскімі сцягамі, тут і некалькі пенсіянерак з каструлямі, тут і анархісты з чорнымі палотнішчамі, тут і камуністы з чырвонымі савецкімі сцягамі. Быў і афіцыйны чырвона-зялёны сцяг, і нацыянальны бел-чырвона-белы... І ўсё было б добра, калі б хоць пад якім-небудзь з гэтых сцягоў сабраліся дзесяткі, сотні тысяч чалавек, а так — адзінкі. І кожны — разумны, у кожнага свая стратэгія: адны ідуць на Бангалор, другія — на Кастрычніцкую плошчу; адны — налева, другія — направа... Як вынік — масавая бойка, што адбылася падчас акцыі.

Нешта не тое адбываецца ў дэмакратычным асяродку. Барацьба за ўплыў у сваім вузкім коле падмяніла сабой барацьбу за галовы і сэрцы простых людзей. Як вынік — выйграе дзяржава, якая метадам правакацый і сутыкненняў канчаткова разводзіць апазіцыйных лідэраў і апазіцыйныя рухі. Але па аднаму мы ўсе слабейшыя, чым разам.

...І з крыкамі «Зіг!» кінуліся біцца

— Хлопцы, а вы хто? — пытаюся ў маладых людзей, якія моўчкі выстраіліся ў салдацкую калону і стаяць пад бел-чырвона-белым сцягам з чорным ромбам-канвертам пасярэдзіне. Стаяць на правым баку плошчы ля Акадэміі навук, бліжэй да Першай клінічнай бальніцы.

— Мы "Белая воля", — на чыстай рускай мове адказвае адзін з маладых людзей. — Мы выступаем против наркотиков, против пьянства, присоединяйтесь...

— Нешта пра вас не чутно было... Вы не з РНЕ часам? — усё-ткі было нешта падазронае ў паводзінах гэтай маўклівай групы: стаяць, як у каравуле, гледзячы адзін аднаму ў патыліцу. Яны не ў чорным, як пра гэта напісалі некаторыя СМІ. Яны звычайныя маладыя хлопцы ў джынсах, куртках, вось толькі, калі калона пачынае рухацца, нацягваюць на твары шалікі.

— Нет, мы "Белая воля", — і хлопец займае сваё месца ў калоне паплечнікаў.

На другім баку плошчы — не менш каларытная група пад чорнымі і чорна-чырвонымі сцягамі і з барабанамі. "Мы анархісты", — ахвотна расказваюць яны пра сябе. — Мы не столькі супраць адмены льгот, колькі супраць самой дзяржавы".

...Праз нейкія паўгадзіны гэтыя маладыя людзі, нейкім чынам апынуўшыся ў калоне адзін каля аднаго, з крыкамі "Зиг!", "Кровь!", "Вали!" учыняць жорсткую бойку перад тэлекамерамі Беларускага тэлебачання. "Белая воля" і анархісты будуць смачна біцца, ламаючы на галовах адзін аднаго дрэўкі ад сцягоў. А потым пакідаюць сцягі і кінуцца ў двары дамоў уздоўж вуліцы Сурганава. Міліцыя не зловіць нікога, аніводнага!..

Зараз я ўжо дакладна ўспомніла, што і раней чула пра "Белую волю", з ёй ужо быў скандал. Цыганскія грамадскія арганізацыі патрабавалі прыцягнуць самаабвешчаную арганізацыю-барацьбітку "за чысціню нашай нацыі" да крымінальнай адказнасці за прапаганду міжнацыянальнай варожасці. Зразумела, што нічым гэтая спроба не скончылася.

У інтэрнеце "Белая воля" мае свой сайт. На ім пазначана, што арганізацыя — гэта рух нацыянальнага супраціву. І расказ пра праведзеныя акцыі — "БТ — зброя ў руках ворагаў нашай нацыі", "Незалежнасць за чужыя грошы не купіш", "25 сакавіка — час задумацца пра незалежнасць"... Пра апошнюю акцыю на ім таксама змешчана справаздача. Зрэшты, сайт беларускамоўны.

Але пра "Сацыяльны марш" напісана па-руску. Згодна з гэтай версіяй, "Белая воля" ўзяла ўдзел у маршы, бо спадабаўся пасыл — не "еўрапейскія каштоўнасці" і "наладжванне дыялогу з уладамі", а абарона сацыяльных гарантый. Як сцвярджаецца, лозунгі "Белай волі" былі такімі — "Белая Воля!", "Нацыя! Айчына! Воля!", "Нет контрактной системе!", "Акции народу — а не олигархам!", "За кроў! За гонар! За нашу Долю! За Белую Волю!". Але да калоны нібыта прыбіліся нейкія правакатары, якіх з-за іх правакацыйных лозунгаў прыйшлося проста выгнаць.

На сайце "Белай волі" прызнаецца, што ўдзел у акцыі апазіцыі для членаў арганізацыі скончыўся "крайне глупо". І выказваюцца словы прабачэння за "не заўсёды адэкватныя лозунгі, што выкрыквалі людзі, якія ішлі з намі ў адной калоне. Калі пачалося сутыкненне, магчымасцяў кантраляваць спадарожнікаў не засталося. Улічваючы такі не самы ўдалы вопыт, мы абяцаем надалей больш пільна падысці да фільтрацыі сваіх калон. Дапускаць "левых людзей" у свае калоны больш не будзем, бо парадак больш важны за масавасць".

Па гарачых слядах палітыкі і журналісты палічылі, што менавіта "Белая воля" справакавала сутыкненні. Яны гэта катэгарычна адмаўляюць. Тады хто?.. Анархічны рух Беларусі больш вядомы ў дэмакратычным асяродку.

Чырвона-чорны сцяг ужо не аднойчы можна было бачыць на акцыях апазіцыі. Акцыя анархістаў "Дзякуй прэзідэнту за хлеб і малако", праведзеная ў кастрычніку 1994 года, наогул стала першай антыпрэзідэнцкай кампаніяй у Беларусі.

У панядзелак анархісты таксама распаўсюдзілі свой прэс-рэліз. Прабачэнняў не прынеслі, але запэўнілі ўсіх, што на "Сацыяльным маршы" яны былі настроены мірна. "Аб чым сведчыць наяўнасць у іх блоку значнай колькасці дзяўчат. Ажыўленне ў сумную атмасферу шэсця ўносілі барабаншчыкі, якія гралі самбарытмы... Па ходзе шэсця нацысты сталі выкідваць рукі з гітлераўскім прывітаннем, у адказ анархісты скандіравалі "Фашызм не пройдзе!", — гаворыцца ў прэс-рэлізе анархістаў. А потым пачалася бойка.

У сітуацыі напружанасці, недаверу, насцярожанасці дастаткова было іскры, каб узгарэлася полымя. І ўсё ж хто крычаў "Зіг!"? Хто ёсць сапраўдныя правакатары?.. Зразумела, што тут дзейнічаў прафесійны рэжысёр, бо спачатку міліцыі і бачна не было, а тут раптам як з-пад зямлі выраслі.

Самы лепшы экспрэс-каментарый на гэты конт даў фельчар "хуткай дапамогі" з Жодзіна Аляксандр Ваўчанін: *"Калі дзяржава не жадае ісці на дыялог з апазіцыяй — узніклую пустэчу займаюць фашысты. Гэта мы і бачылі".*

Як нам здаецца, тэма патрабуе больш глыбокага вывучэння. У бліжэйшых нумарах мы паспрабуем прааналізаваць, чыімі рукамі робяцца правакацыі ў дачыненні да грамадскіх актывістаў і што сабой уяўляюць крайне левыя ("Белая воля", РНЕ, антыглабалісты і інш.) і крайне правыя (анархісты, "Чырвоны жонд" і інш.) флангі беларускага супраціву.

Алена НОВІКАВА.
Фота bymedia.net

"Безумоўна, бойка на "Сацыяльным маршы" — гэта спланаваная правакацыя. Яна была патрэбна для таго, каб паказаць гэта ўсё па БТ. Што і было зроблена. У Беларусі няма фашыстаў. Шмат гадоў былі групоўкі футбольных хуліганаў, зараз жа ёсць спроба стварыць групоўкі, якія будуць учыняць правакацыі, запалохваць людзей".

Так пракаментаваў тое, што адбылося на "Сацыяльным маршы", адзін з лідэраў незарэгістраванага "Маладога фронту" ***Зміцер Федарук****.*

ГУЧНАЯ СПРАВА

Пачынаецца новы суд над Дзмітрыем Дашкевічам

Суд над адным з лідэраў маладзёжнага апазіцыйнага руху Дзмітрыем Дашкевічам павінен быў пачацца 6 лістапада, але перанесены на пятніцу. Пра гэта паведаміў адвакат мвладзёжнага актывіста Аляксандр Галіеў.

Паводле яго слоў, пасяджэнне перанесена з-за фармальнай прычыны: абвінавачаны павінен быў атрымаць пастанову аб прызначэнні даты і часу судовага працэсу не пазней, чым за пяць сутак да яго пачатку. Аднак гэтую пастанову Дашкевіч атрымаў 1 лістапада, і поўныя пяць сутак на час пачатку працэсу яшчэ не прайшлі. На падставе гэтага суддзя Таццяна Кашкіна вырашыла перанесці працэс.

"Дзмітрый Дашкевіч адчувае сябе нармальна, трымаецца добра, не хварэе, ніякіх скаргаў у яго пакуль няма", — паведаміў А.Галіеў.

Нагадаем, Зміцер адбывае пакаранне ў калоніі агульнага рэжыму №17 у Шклове па абвінавачванні ў дзейнасці ад імя незарэгістраванай арганізацыі "Малады фронт". Прыгавор быў вынесены 1 лістапада 2006 года. Дзмітрыя асудзілі на паўтара года пазбаўлення волі. Судовы працэс праходзіў у закрытым рэжыме.

Новая справа ў дачыненні да 26-гадовага апазіцыянера была распачата 14 жніўня на падставе артыкула 402 Крымінальнага кодэкса (адмова або ўхіленне сведкі або пацярпелага ад давання паказанняў), што прадугледжвае пакаранне да трох гадоў пазбаўлення волі. Д.Дашкевіч абвінавачваецца ў адмове ад давання паказанняў па справе, распачатай у дачыненні да Івана Шылы, якому інкрымінавалася дзейнасць ад імя незарэгістраванай арганізацыі "Малады фронт". 4 верасня І.Шыла быў прызнаны вінаватым. У якасці пакарання суд вынес яму афіцыйнае папярэджанне.

Праваабарончая арганізацыя "Міжнародная амністыя" прызнала Д.Дашкевіча вязнем сумлення, а беларуская апазіцыя стварыла камітэт па яго вызваленні і аб'явіла аб арганізацыі міжнароднай кампаніі салідарнасці з маладым палітыкам.

Сяргей ПУЛЬША.

КУЛУАРЫ

Канаплёва вывелі з Савета бяспекі

Былога старшыню Палаты прадстаўнікоў Уладзіміра Канаплёва вывелі са складу Савета бяспекі. Адпаведны ўказ падпісаў Аляксандр Лукашэнка.

Падрабязнасці адстаўкі Канаплёва дагэтуль не выдаюцца, але ў версію сыходу з пасады "па стане здароўя" адразу ніхто не верыў. У парламенцкіх колах гавораць, што іх былы шэф некалькі тыдняў таму вярнуўся ў Беларусь, спадзеючыся на асабістую аўдыенцыю ў Лукашэнкі. Але яна, судзячы па ўсім, усё ж такі не адбылася.

Требуют освободить Александра Козулина

Под таким обращением к А.Лукашенко поставили подписи почти сорок человек. "Мы, граждане Республики Беларусь, вынуждены, не затрагивая в целом проблем политического положения в стране, сложившегося белорусского избирательного и законодательного процесса, обратиться с настоятельным предложением об освобождении Александра Владиславовича Козулина", — говорится в документе.

Авторы обращения напоминают, что уголовное преследование и осуждение кандидата в Президенты на выборах весной 2006 года, председателя Белорусской социал-демократической партии (Грамада) А.В.Козулина, согласно мнению защитников, независимых юристов, правозащитных организаций Беларуси и зарубежья является политически мотивированным, необоснованным и незаконным. Всемирная правозащитная организация "Международная амнистия" объявила А.В.Козулина узником совести и призвала белорусские власти его освободить.

В настоящее время у генерального прокурора Республики Беларусь П.П.Миклашевича находится на рассмотрении надзорная жалоба адвоката, защищающего А.В.Козулина, с требованием принести протест на предмет отмены судебных решений в отношении А.В.Козулина и прекращения производства по уголовному делу за отсутствием в его действиях составов инкриминируемых ему преступлений. То есть инстанции судебно-правовой системы Беларуси еще имеют возможность объективно рассмотреть уголовное дело А.В.Козулина.

"Мы уверены, что судебно-следственные ошибки по уголовному делу против А.В.Козулина должны быть исправлены. Поэтому призываем проявить гражданское мужество, честность и использовать имеющуюся власть во благо — незамедлительно освободить из мест лишения свободы Козулина Александра Владиславовича", — говорится в заключении обращения.

США готовят новые санкции против режима Лукашенко

Вашингтон готов пойти на новые санкции в отношении властей Беларуси. Об этом в интервью Радио Свобода заявил заместитель помощника госсекретаря США Дэвид Кремер. По его словам, такие шаги американцев связаны с тем, что белорусское руководство отказалось выпустить на свободу людей, которых в Вашингтоне считают политзаключенными.

Кремер рассказал, что в апреле этого года встречался с заместителем главы Администрации президента Беларуси Натальей Петкевич. *"Я считал, что это хороший повод, и сказал ей о конкретных мерах, как можно улучшить отношения между Беларусью и США. Главным условием было освобождение всех политзаключенных. Не двух или трех, хотя мы приветствовали и это, а всех. Мы им передали список этих заключенных, чтобы они знали, о ком мы говорим",* — пояснил Кремер.

Однако, по его словам, в Минске не пожелали прислушаться к просьбам Вашингтона, а, напротив, "режим усилил давление на оппозицию и активистов неправительственных организаций".

Кремер пообещал, что о новых санкциях станет известно в течение следующей недели. Чиновник также особо отметил, что Вашингтон будет продолжать оказывать давление на белорусские власти и поддерживать оппозицию, рассчитывая, что такая политика "принесет плоды".

Вуліцы Янкі Брыля не будзе?

Вераснёўскае рашэнне дэпутатаў Мінгарсавета аб перайменаванні вуліцы Берсана ў вуліцу Вайніловіча, а таксама наданні гарадскім вуліцам імён Льва Сапегі і Янкі Брыля не прайшло прававой экспертызы ў Міністэрстве юстыцыі.

Фармальнай прычынай для адмовы рэгістраваць дакумент стала тое, што, згодна з законам аб мясцовым самакіраванні, падобныя рашэнні мусяць абмяркоўвацца з насельніцтвам. Аднак усе добра памятаюць, што перайменаванне праспектаў Францыска Скарыны і Пятра Машэрава ні з кім не абмяркоўвалася. Наадварот, людзі абураліся такім рашэннем. І ўсё ж улады цвёрда стаялі на сваім.

Чым не спадабаліся Мінюсту славутыя сыны зямлі беларускай, невядома. Але падобна на тое, што сённяшняй уладзе больш падабаюцца імены Леніна, Дзяржынскага, Свярдлова, Мяснікова — катаў свайго народа.

Алена НОВІКАВА.

ТАК І СКАЗАЎ

Прачнуліся...

"Вучоныя павінны ініцыяваць прыняцце заканадаўчай нормы аб тым, што свабоднае валоданне абедзвюма дзяржаўнымі мовамі з'яўляецца абавязковай умовай для прыёму спецыяліста на службу ў любую дзяржаўную ўстанову". "Калі вучань і ягоныя бацькі будуць разумець, што, каб у будучым заняць нейкую пасаду, спатрэбіцца па-сапраўднаму ведаць беларускую мову, то яны ў корні зменяць сваё стаўленне да яе навучання. Пры гэтым беларускае грамадства атрымае чалавека, найбольш падрыхтаванага да паспяховай дзейнасці ў сучасных умовах, шматмоўнай і шматкультурнай сусветнай супольнасці".

Аляксандр ЛУКАШАНЕЦ,
дырэктар Інстытута мовазнаўства імя Я.Коласа.

Народная Воля http://www.nv-online.info
8 ЛІСТАПАДА 2007 г.

ПЕРСОНА

Василий ЛЕОНОВ:

«У меня нет желания мстить тем, кто приказал бросить меня за решетку...»

Ровно десять лет назад, 11 ноября 1997 года, на бывшего министра сельского хозяйства и продовольствия **Василия Леонова** *прямо в кабинете надели наручники*

Этот грустный "юбилей" Василий Севостьянович, естественно, не отмечает. Но и не забывает. Он уверен, что когда сменится власть, его дело будет пересмотрено.

— Я, конечно, иногда вспоминаю подробности ареста, — говорит Василий Леонов. — Прошло десять лет, но ничего не забылось. Помню все. Освободился я в октябре. На улице в тот день было очень солнечно...

У меня нет желания мстить тем, кто приказал бросить меня за решетку. Я придерживаюсь принципа, что месть — это удел бессильных. А с другой стороны — они ведь все равно получат то, что заслужили...

— А кое-кто утверждает, что если сменится власть, то отдельным руководителям государства не удастся избежать тюрьмы...

— Я не судья. И в жизни многим помог избежать тюрьмы. И Лукашенко, если вы о нем говорите, для меня не будет исключением: я инициировать его посадку не буду. Но спасать его я тоже не собираюсь.

— Василий Севостьянович, в своей книге "Работа над ошибками" вы пишете, что Виктор Шейман пытался несколько раз упрятать вас за решетку. Чем была вызвана такая нелюбовь?

— Это была не нелюбовь, а война за спиртовые заводы и спиртовые деньги. Об этом я подробно написал в своей книге. В этой войне, кстати, были замешаны многие высокопоставленные чиновники...

— Лукашенко обвинил вас в убийстве бывшего председателя Комитета госконтроля по Могилевской области Евгения Миколуцкого... Почему, на ваш взгляд, его убийцы до сих пор не найдены и не наказаны?

— Да, во вторник меня посадили, а в пятницу, 14 ноября, Лукашенко назвал меня убийцей. Хотя в суде это обвинение не фигурировало. Видимо, Лукашенко бросил его, чтобы оправдать необходимость моего немедленного ареста... А что касается настоящих убийц... Как я теперь понимаю, "заказ на Миколуцкого" исполняли те же, кто должен был его раскрыть...

— Находясь в изоляторе, вы написали открытое письмо Александру Григорьевичу...

— Да. И намерен написать еще одно письмо ему — перед тем, как он будет сдавать свой пост.

— Вас предупреждали об аресте. И накануне даже предлагали уехать из страны. Не жалеете, что не согласились?

— Ну а куда бы я уехал? И если бы уехал, то все точно решили бы, что я что-то украл. А так в деле фигурирует больше двухсот человек, и никто, кроме Василия Константиновича Старовойтова, не говорит, что я что-то украл. Но я ничуть не сомневаюсь, что, как только Лукашенко лишится поста президента, мое дело будет пересмотрено. Приговор мне был вынесен незаконно. Сейчас я свободно хожу по стране. Мне не стыдно ни перед собой, ни перед детьми, ни перед внуками...



Марина КОКТЫШ.
Фото photo.bymedia.net

КАК ЭТО БЫЛО

О подковерных войнах

...Мой арест готовился заранее. Даже отправили в отпуск, чтобы не путался под ногами, да еще, не дай Бог, публично не ляпнул что-нибудь непозволительное. Съездил в Сочи подлечиться, а на обратном пути заглянул в Белгород — откуда было предложение о новом месте работы. Показали и дом, в котором буду жить, оговорили место работы жены. Но за мной уже "ездили" — следили вовсю, подслушивали. Даже в Белгороде "сопровождал хвост": я его обнаружил абсолютно точно, когда с белгородским губернатором Савченко отправился вместе поужинать. Стать жителем Белгорода так и не довелось. Вернулся в Минск, и вскоре на меня надели наручники.

Это был второй, увенчавшийся успехом, заход усадить меня за решетку. Первый был в самом начале 1997 года, когда государственный секретарь Совета безопасности Виктор Шейман затеял многоходовую комбинацию по обвинению министра сельского хозяйства и продовольствия Леонова во вредительстве. Шейман изобретал почти детективную версию: Леонов закупил за рубежом токсичный шрот, завез в Беларусь, чтобы отравить скот и птицу. Ежов и Берия, вероятно, были столь же изобретательны. Шейман дал телеграмму на все комбинаты: запретить скармливать шроты, поскольку они токсичны. Я узнал об этом на планерке. "В чем дело? — спрашиваю. — Коль шрот токсичен, то должен быть массовый падеж и птицы, и скота". — "Все хорошо, — отвечают мне, — даже снижение привесов не наблюдается. Просто есть такая телеграмма". Срочно требую заключение из ветлаборатории. Дали заключение: есть некоторая кислотность, но в пределах допустимой нормы, можно скармливать безбоязненно. Два заместителя министра оказались между двух огней: с одной стороны — телеграмма Шеймана, с другой — мое жесткое указание ежевечерне докладывать лично мне, сколько шротов за день скормлено. Я ведь хорошо понимал: не скармливать шрот — все равно что сгноить его. Белковые корма невозможно хранить при температуре в 30 градусов. Месяц — и шроты превратятся в навоз.

Даже теперь я не понимаю, как у меня хватило сил настоять на своем, добиться от подчиненных выполнения моего приказа, а не приказа грозного Шеймана. Было очевидно, что идет подковерная борьба за рынок, в которой не гнушаются никакими средствами, чтобы убрать с пути "досадную помеху" — несговорчивого министра. Просиди я без движения неделю-другую, и можно было бы представить абсолютно достоверное заключение о непригодности шрота. И кто бы стал разбираться, почему это заключение датировано 25 апреля, а не, скажем, 30 марта. Пять миллионов долларов выбросил — и отвечай по полной программе, Леонов...

У Владимира Гиляровича Гаркуна при одной мысли об этом капал пот с пальцев: "Ты что! Это же Шейман! Не смей скармливать шрот!" — "А ты понимаешь, чем это кончится? — спрашиваю я Гиляровича. — Тогда ты как вице-премьер запрети мне скармливать, возьми на себя такую ответственность! А я знаю, что шроты годны к употреблению в корм и должны быть скормлены скоту. И это не компетенция Совета безопасности. Есть лаборатория, и я действую на основании ее заключения".

Когда шроты были полностью скормлены, мы подвели итоги борьбы с ведомством Шеймана, написали докладную записку, с которой я пошел к президенту и задал прямой вопрос: "Что за дебилы сидят в вашем Совете безопасности?" Рассказал ему всю эту историю, как и что делалось, пояснив, что если бы мне на самом деле взбрело в голову покупать токсичные шроты, корабль не загрузили бы, не проверили образцы, капитан не позволил бы это сделать без международного сертификата. Потом в Гамбурге склады на выгрузке не приняли бы груз без нового сертификата. Затем в Клайпеде брали на анализ, когда перегружали в поезд. Всюду — международные службы, независимые экспертизы! И вдруг специалисты Шеймана безапелляционно заявляют, что шроты токсичны, запрещают к скармливанию.

Лукашенко меня выслушал без всякой враждебности, при мне надавил на кнопку селектора и вызвал Шеймана: "Какие там придурки у тебя вели это дело?"

Вот так закончилась эта дурацкая история. Президент после разговора сказал: "Я посмотрю, что на тебя там Шейман собрал". Я понял: Шейман собирает на меня компромат, и президент об этом знает...

Об убийстве Миколуцкого

О своей "причастности" к убийству Евгения Миколуцкого я узнал в изоляторе КГБ из телепередачи. Меня посадили во вторник, а в пятницу вечером ОРТ показало репортаж из колхоза "Рассвет", где Лукашенко обвинил Леонова и Старовойтова: именно они, как он выразился, "убрали Миколуцкого". Первое, что пришло в голову, — бред какой-то! До этого высказывания я думал, что Шейман организовал очередную провокацию, и меня должны скоро выпустить...

Когда в пятницу прозвучали слова о моей причастности к убийству Миколуцкого, я стал понимать: идет хорошо спланированная Шейманом провокация с личным участием президента. От этих господ можно ждать чего хочешь — коварства, мести, лжи, садистской жестокости.

Конечно же, обвинение в убийстве Миколуцкого — это абсолютный бред. И не удивительно, что почти четыре месяца никто не задавал мне вопросов об убийстве Миколуцкого. Я пишу из изолятора матерные письма генеральному прокурору Олегу Божелко: сволочи, что же вы делаете? Ведь президент же сказал, в чем меня обвиняют! Начинайте спрашивать, негодяи! И лишь когда меня перевели в Жодинский изолятор, приехал следователь из Могилевской прокуратуры, начал меня спрашивать, в каких отношениях я с Валерием Ткачевым, который якобы и убил Миколуцкого. При этом присутствовал генерал Николай Лопатик. Мы проговорили часа три-четыре. На следующий день они составили обстоятельный протокол, я его вычитал и подписал. Как свидетель по делу об убийстве Миколуцкого. В подобных случаях положено этому протоколу быть и в моем уголовном деле. Там его нет: давным-давно изъяли или даже не подшивали туда, нарушив все процессуальные нормы.

Вообще картина получилась, мягко выражаясь, веселая. Бывший первый секретарь обкома, а потом министр, сидит в тюрьме, при этом генеральный прокурор когда-то был инструктором у него в аппарате обкома, а президент проходил номенклатурное согласование. Семь или восемь человек, так или иначе имевших отношение к моей судьбе как к судьбе подследственного и заключенного, и от меня когда-то зависела их судьба. Впору было рехнуться. Но такого удовольствия я им доставить не мог...

Когда вышел из тюрьмы, мы не раз говорили с Олегом Божелко. По его рассказам, он о моем аресте узнал из телефонного разговора с Виктором Шейманом. Шейман лично вызвал к себе заместителя генерального прокурора Петра Иваненко и приказал подписать ордер. Ордер подписали в понедельник, а Божелко узнал об этом во вторник. Все остальные, кроме Лукашенко и Шеймана, ровным счетом ничего не знали и не значили в этом моем "деле".

О наручниках

Арест проходил предельно просто, буднично. Я даже забыл, что меня предупредили накануне. 11 ноября около 16 часов в кабинет неожиданно зашел помощник и сообщил: "Там пришли какие-то люди и рвутся к вам с каким-то следственным экспериментом!" Ну, рвутся, так пусть заходят. Вошло человек двадцать с двумя кинокамерами. Что за эксперименты? Следователь Молочков садится и представляет ордер на мой арест. Вот тогда я вспомнил и о вчерашнем предупреждении, не жалея, что не подался в бега.

Начали искать. Смотрели люки, через которые проходят кабели связи. Искали взрывное устройство. Потом взяли пылесос, оставленный в комнате отдыха уборщицей, и долго крутили, боясь открыть. Выскребли все ящики, забрали кипу визиток (более 300) моих бывших посетителей, которых потом долго тягали на допросы. Перерыли все бумаги. Я надел плащ, вышел из кабинета, и тут, в коридоре, уже перед камерами на меня решили надеть наручники.

Это вызвало у меня такой идиотский смех. Министра ведут по длинному министерскому коридору в наручниках, снимая на камеры. Встречный народ в ужасе прижимается к стенам, ничего не понимая. Меня выводят из здания Минсельхозпрода, где у подъезда стоят три больших джипа: приехали "брать", как какого-нибудь бандита. Сажают в один из джипов и везут в тюрьму КГБ. Смех продолжается. Я спрашиваю у севших по бокам парней в штатском: "Мать вашу, какой концерт вы затеяли? Что вам надо от меня?! И железяки эти нацепили! Не волнуйтесь, я от вас никуда не убегу! Прогонять будете — не уйду!" Один из охранников, старше, как видно, не только возрастом, но и званием, недовольно бросает: "Ладно, снимайте наручники!"

Открывают ворота, и меня ввозят во двор КГБ. Там вход в тюрьму. Самое отвратительное — обыск. Тебя раздевают до трусов и руками перебирают все одежду. Потом проверяют, не спрятал ли ты чего-нибудь в трусах. Большей брезгливости я не испытывал никогда. "Одевайтесь!" Отобрали галстук, шнурки — по инструкции, чтобы не повесился.

Об Олеге Божелко

"Дело Леонова" стояло на контроле у главы государства, по должности обязан был следить за ним и генеральный прокурор Олег Божелко, когда-то работавший со мной в Могилевском обкоме партии. Я писал ему письма по существу дела, но он ни разу не ответил. Позже, когда я уже был на свободе, а Олег Александрович находился в России, мы встретились. Он честно объяснил, почему не отвечал: "Я все равно ничего не мог бы изменить. Мне было сказано главой государства: ты туда не вмешивайся".

У меня нет оснований не верить Божелко.

О самых тяжелых днях

В моей тюремной одиссее было три тяжелых, стрессовых дня. Первый — когда арестовали в кабинете и бросили за решетку. Второй — когда в изолятор КГБ на свидание пришла жена, и третий — когда впервые вышел в зал суда под прицел фото- и кинокамер, ощутил на себе взгляды журналистов. К этому готовишься, понимаешь, что все будет именно так, но все-таки не так, психологическое состояние прескверное: сидишь в клетке, как зверь в зоопарке, как матерый преступник, тебя фотографируют через решетку...

(Из книги Василия Леонова "Работа над ошибками".)

АДУСЮЛЬ

Вось дык ашчаслівілі!

Урад Беларусі з 1 снежня 2007 года павышае базавую велічыню да 35 тысяч. Нагадаем, цяпер базавая велічыня складае 31 тысячу.

Згодна з пастановай Савета міністраў, у 1,13 раза павялічваюцца дапамогі па беспрацоўі і стыпендыі грамадзянам, якія праходзяць прафесійнае навучанне па накіраванні органаў дзяржаўнай службы занятасці.

Масавае атручэнне на Гомельшчыне

Наркатычным насеннем атруціліся больш за 30 падлеткаў. Медыкі аказваюць ім экстраную медыцынскую дапамогу, а міліцыя шукае распаўсюджвальнікаў зелля. Крыніца небяспекі — дурнап'ян звычайны.

Гэтая расліна ўпрыгожвае шматлікія школьныя і гарадскія кветнікі. Дзесяцігоддзямі яна ўспрымалася як бясшкодная дэкаратыўная. Але ў ёй змяшчаецца рэчыва атрапін, якое, на думку медыкаў, і выклікае моцнае расстройства нервовай сістэмы.

Цяпер ідзе барацьба з дурнап'янам. Шматлікія школьныя двары ўжо вычышчаны ад атрутных парасткаў. А ў наступным годзе небяспечнае ўпрыгожванне плануецца наогул прыбраць з гарадскіх кветнікаў.

Урачыстасці пачнуцца ў 11 гадзін

Урачыстасці з нагоды кананічнага ўступлення на пасаду новага арцыбіскупа мітрапаліта Мінска-Магілёўскага Тадэвуша Кандрусевіча, якога прызначыў Папа Рымскі Бенедыкт XVI, адбудуцца 10 лістапада ў мінскім архікатэдральным касцёле Імя Найсвяцейшай Панны Марыі.

Яго Эксцэленцыя праз шаснаццаць гадоў жыцця і працы ў Расіі вяртаецца на Радзіму. Ён нарадзіўся і вырас на Гродзеншчыне, служыў там некалькі гадоў. Як зараз гаворыць: "Я шчаслівы, што вярнуўся на Радзіму".

Трывожны званок

Міністэрства юстыцыі Рэспублікі Беларусь вынесла пісьмовае папярэджанне Грамадскаму аб'яднанню "Таварыства беларускай школы".

Падставай стала правядзенне ў памяшканні гродзенскай структуры ТБШ выставы, прысвечанай дзейнасці незарэгістраванага "Маладога фронту". Паводле меркавання Мінюста, такім чынам ГА "Таварыства беларускай школы" спрыяе дзейнасці забароненай арганізацыі.

Апошні шлях салдат Напалеона

На 25 лістапада запланавана цырымонія перапахавання астанкаў салдат арміі Напалеона на могілках ля вёскі Студзёнка (Барысаўскі раён, Мінская вобласць). Пра гэта паведаміла пасольства Францыі.

Астанкі 223 французскіх салдат будуць пахаваны на спецыяльным участку могілак на беразе Бярэзіны насупраць помніка салдатам і афіцэрам французскай арміі. Помнік знаходзіцца на супрацьлеглым беразе ракі на Брылёўскім полі.

Нагадаем, у жніўні 2005 года непадалёк ад вёскі Селішчы ў Вілейскім раёне, на адлегласці 80 кіламетраў ад Мінска, 52-і спецыялізаваны пошукавы батальён Міністэрства абароны Беларусі знайшоў астанкі 224 салдат напалеонаўскай арміі, якія загінулі ў баі або замерзлі насмерць у сне. Дзякуючы гузікам уніформы, што захаваліся, удалося вызначыць іх палкі.

26 лістапада 2006 года ля помніка салдатам і афіцэрам французскай арміі на Брылёўскім полі адбылася цырымонія развітання, падчас якой быў пахаваны прах аднаго салдата.

Дзякуйце Савету міністраў

З прылаўкаў брэсцкага Цэнтральнага рынку знік хадавы тавар — яйкі. Цяпер замест "курынага прадукту" там красуецца красамоўны плакат: "Яек няма! Дзякуйце Савету міністраў".

Ля гандлёвых прылаўкаў цяпер нязвыкла пуста. І толькі вялізная чарга стаіць за прадукцыяй Кобрынскай птушкафабрыкі. Здзіўленыя гараджане закупляюцца ў запас.

"Згодна з пастановай Савета міністраў №1256, на рынках забараняецца продаж яек харчовых, за выключэннем продажу ў крамах, размешчаных на тэрыторыі рынку, а таксама продажу вытворцамі, — пракаментаваў сітуацыю дырэктар рынка Дзмітрый Глушынскі. — У дадзенай сітуацыі мы толькі выканаўцы".

ПОДРОБНОСТИ

Дата суда над Владимиром Холодом еще не назначена

Но уже известно, что уголовное дело бывшего ответственного сотрудника Администрации президента и члена Центризбиркома будет рассматривать судья ***Ирина Тылец.***

Напомним, что дело **Владимира Холода** вызвало большой общественный резонанс. Однако судебные слушания пройдут в закрытом режиме.

На вопрос "Народной воли" о том, почему суд над Холодом будет закрытым, генеральный прокурор Беларуси **Петр Миклашевич** ответил, что *"под грифом "секретно" расследуются дела при наличии для этого объективных обстоятельств"*. Правда, что за *"объективные обстоятельства"* возникли в деле чиновника Холода, Миклашевич так и не объяснил.

"Не можем мы любое дело засекретить и проводить секретное расследование, — сказал Миклашевич. — *Мы стремимся давать своевременную и объективную информацию о расследуемых делах в тех пределах, которые допустимы в ходе расследования".*

Кстати, во время пресс-конференции для российских средств массовой информации Александр Лукашенко "спрогнозировал", что Холоду дадут примерно 13 лет.

"Кому-то наобещал, его там прихватили, попросили у меня разрешения на оперативную разработку, — сказал Лукашенко. — *Пожалуйста — разработали. Под контролем две взятки дал. Посадили — вот пусть теперь отмазывается. А это лет, наверное, 13... Лет 13 получит..."*

Посмотрим, какой приговор теперь вынесет Холоду **Ирина Тылец...**

Марина КОКТЫШ.

КСТАТИ

Кресло Холода уже занято

В конце октября А.Лукашенко своим указом назначил Василия Бущика членом Центральной комиссии Республики Беларусь по выборам и проведению республиканских референдумов.

До недавнего времени доктор политических и кандидат философских наук **Василий Бущик** работал проректором по научной работе Белорусского государственного педагогического университета им. Танка. Еще Василий Васильевич возглавлял экспертный совет ВАК.

ИЗ АРХИВА

Первый заместитель начальника Главного идеологического управления Администрации президента, член Центризбиркома Владимир Холод был задержан сотрудниками правоохранительных органов и заключен под стражу 30 июня 2007 года.

Лукашенко освободил Холода от должности члена ЦИК.

19 сентября следствие направило дело Холода в Генеральную прокуратуру для передачи в суд. Холод обвиняется в подстрекательстве к даче взятки в крупном размере, в покушении на завладение имуществом путем мошенничества в крупном размере и мошенничестве, совершенном повторно в особо крупном размере.

25 сентября Генпрокуратура передала уголовное дело Владимира Холода в Верховный суд Беларуси.

ПРЫГАВОР

Непарадак ва ўнутраных войсках

Мінскім міжгарнізонным ваенным судом да сямі гадоў пазбаўлення волі ў калоніі ўзмоцненага рэжыму з канфіскацыяй маёмасці, пазбаўленнем права займаць арганізацыйна-распарадчыя пасады тэрмінам на чатыры гады і пазбаўленнем воінскага звання падпалкоўніка прыгавораны былы начальнік службы артылерыйскага ўзбраення Галоўнага ўпраўлення камандуючага ўнутранымі войскамі МУС.

Прысуд вынесены на падставе ч.1 арт.294 (крадзеж агнястрэльнай зброі, боепрыпасаў або выбуховых рэчываў), ч.2 арт.295 (незаконныя дзеянні ў адносінах да агнястрэльнай зброі, боепрыпасаў і выбуховых рэчываў), ч.2 арт.430 (атрыманне хабару), ч.1 арт.455 (злоўжыванне ўладай, перавышэнне ўлады або бяздзеянне ўлады) Крымінальнага кодэкса і набыў законную моц.

Як паведамілі БелаПАН у Беларускай ваеннай пракуратуры, устаноўлена, што ў ліпені, а затым у верасні 2006 года афіцэр за хабар адпаведна ў 250 долараў і 130 тыс. расійскіх рублёў спачатку шляхам прадастаўлення камандаванню няправільных звестак, што сталі падставай для неправядзення тэндэрных таргоў, а затым шляхам выключэння па надуманых падставах шэрагу прэтэндэнтаў на ўдзел у тэндэры аказаў садзеянне дырэктару адной з фірм у заключэнні дагавора на пастаўку ваеннай спецыяльнай маёмасці спачатку на больш чым 11 млн рублёў, а затым на суму прыблізна паўмільярда рублёў для патрэб унутраных войск.

У лістападзе 2006 года афіцэр, які ўваходзіў у склад спартыўнай каманды па стральбе і ўдзельнічаў у трэніроўках, выкраў выдадзеныя яму для службовага карыстання 16 патронаў да пісталета Макарава, якія незаконна захоўваў у службовым сейфе.

Вячаслаў БУДКЕВІЧ.

ЁСЦЬ ПЫТАННЕ...

Дзе шукаць «Старэйшын»?

Уважліва сачу за публікацыямі газеты, якія тычацца стварэння грамадскага аб'яднання пенсіянераў. Апошні раз, яшчэ летам, газета распавяла, што кіраўнікі незарэгістраванай структуры пасварыліся між сабою і заявілі, што грамадскіх аб'яднанняў пенсіянераў будзе ажно два — "Старэйшыны" і "Новае пакаленне". Але чамусьці нідзе іх не чуваць. Ні на "Еўрапейскім маршы", ні тым больш на "Сацыяльным" не бачыў прадстаўнікоў гэтых структур, не было агітацыйнага матэрыялу. Можа, пару выпуцілі і супакоіліся?

Андрэй ПРАСКУРАЎ, пенсіянер.

Як вядома, яшчэ ў мінулым годзе Міністэрства юстыцыі адмовіла ў рэгістрацыі грамадскаму аб'яднанню пенсіянераў "Старэйшыны" быццам бы з-за тэхнічных памылак у афармленні дакументаў. Безвынікова скончылася і спроба аспрэчыць гэтае рашэнне Мінюста ў Вярхоўным судзе. І замест таго, каб скансалідавацца, стваральнікі "Старэйшын" сапраўды абвінавацілі адзін аднаго ў хлусні, бяздзейнасці, фінансавых махінацыях і разышліся. Так стварыўся прэцэдэнт: пенсіянеры падзялілі арганізацыю, якая дэ-юрэ не існуе.

Кіраўнік незарэгістраваных "Старэйшын" Уладзімір Раманоўскі заявіў, што, нягледзячы на здраду былых аднадумцаў, ад ідэі стварэння арганізацыі з той жа назвай ён не адмаўляецца. У сваю чаргу Таццяна Зялко, якая ўзначаліла крыло, якое адкалолася, таксама заявіла, што будзе намагацца рэгістрацыі ў Мінюсце грамадскага аб'яднання пенсіянераў "Новае пакаленне". З таго часу мінула амаль чатыры месяцы. Але за гэты час нідзе не з'явілася інфармацыя пра дзейнасць амбіцыёзных Уладзіміра Раманоўскага і Таццяны Зялко, пра іх намаганні пашырыць кола сяброў сваіх арганізацый і ў рэшце рэшт зарэгістраваць грамадскія аб'яднанні пенсіянераў. У чым справа? З такім пытаннем мы да іх і звярнуліся.

Уладзімір РАМАНОЎСКІ, "Старэйшыны":

— Не буду хітраваць: сітуацыя зусім дрэнная.

Каб узаемадзейнічаць з арганізацыямі сталых людзей, асобнымі пенсіянерамі, дзяржаўнымі структурамі, асабліва на ўзроўні раённых выканкамаў, трэба мець рэгістрацыю. З прадстаўнікамі неафіцыйнай арганізацыі яны на кантакт не ідуць. Асабліва ў райцэнтрах, дзе стаўленне да недзяржаўных утварэнняў вельмі пужлівае. Атрымліваецца замкнёнае кола: няма сэнсу займацца дзейнасцю, пакуль "Старэйшыны" не зарэгістраваныя. А рэгістраваць арганізацыю, як вядома, Мінюст не хоча. І скажу шчыра, на мой погляд, бессэнсоўна займацца рэгістрацыяй, калі вядома, што вынік будзе адмоўны.

Акрамя таго, зразумела, што любая арганізацыйная работа патрабуе рэсурснага забеспячэння. І калі на ўзроўні крупных гарадоў можна было б спадзявацца на падтрымку дэмакратычных структур, то ў райцэнтрах і вёсках гэтых структур амаль няма.

Сёння ў нас існуе два меркаванні. У такіх умовах амаль не рэальна стварыць грамадскую арганізацыю пенсіянераў. З іншага боку — можна пачаць працэс стварэння аб'яднання, абапіраючыся на дэмакратычны рух. Але ж ці будзе плён ад звароту да дэмакратычных партый і рухаў, якія самі знаходзяцца сёння ў складанай сітуацыі? Таму вось так усё сцішылася, і пакуль мы бяздзейнічаем...

Таццяна ЗЯЛКО, "Новае пакаленне":

— Якраз зараз мы шукаем сродкі, каб правесці ўстаноўчы сход. Спадзяюся, што паспеем сабрацца яшчэ ў гэтым годзе. Каля 100 чалавек з розных рэгіёнаў ужо гатовы прыехаць на сход у Мінск. Пасля сходу будзем рыхтаваць дакументы на рэгістрацыю нашай арганізацыі "Новае пакаленне".

Па-ранейшаму выходзіць газета "Поколение". Прыхільнікі нашай арганізацыі бралі ўдзел і ў "Еўрапейскім", і ў "Сацыяльным маршы". Праўда, былі без плакатаў. Але пры любой магчымасці мы расказваем пенсіянерам пра нашу арганізацыю, запрашаем стаць яе сябрамі.

Вольга ГРЫНЯВІЦКАЯ.

Народная Воля http://www.nv-online.info
8 ЛІСТАПАДА 2007 г.

НЕСКАРОНЫЯ

Вольга і Вячаслаў ДАШКЕВІЧЫ:

«Яго павёў Бог, і мы за гэта ўдзячны»

Ужо больш за год маладзёжны лідэр Зміцер Дашкевіч знаходзіцца ў зняволенні.
Яму пагражае новае крымінальнае пакаранне за адмову сведчыць супраць свайго сябра.
З мэтай падтрымаць бацькоў — Вячаслава Уладзіміравіча і Вольгу Васільеўну Дашкевічаў — мы накіраваліся ў Старыя Дарогі.

У двухпакаёвай кватэры звычайнай шэрай пяціпавярхоўкі быт і ўбранства даволі сціплыя. Але тут мы заўважылі багатую бібліятэку, пабачылі любімыя кніжкі Зміцера, белае плюшавае медзведзянятка на канапе, з якім ён гуляў у дзяцінстве...

— Вольга Васільеўна, мінулы раз вы бачыліся са Зміцерам у жніўні. Раскажыце, калі ласка, пры якіх абставінах адбывалася сустрэча? Як Дзіма выглядаў?

— Мы прыехалі да яго на два дні ў Шклоў і спыніліся ў турэмным інтэрнаце, прызначаным для спатканняў, — распавяла маці. — Нават у гэтыя дні выспацца Дзіму не давялося: усю ноч прыязджалі машыны, бразгталі замкі, надрыўна брахалі аўчаркі. У сем гадзін нас выклікалі на паверку. Сын апранаў куртачку, чорную шапку, і мы выходзілі на пераклічку.

Нас чакаў невялічкі дворык з альтанкамі, лаўкамі і арэлямі, дзе можна глынуць свежага паветра. Усю ежу, якую мы прывезлі, пераглядалі супрацоўнікі. На зоне звычка — разгортваць і правяраць усе цукеркі, якія вязуць арыштантам, адрываць фільтры ад цыгарэт.

Дзіма не паліць, а вось ежу і цукеркі яму перадаць дазволілі. За гэты час сын узмужнеў, ад фізічнай працы стаў шырэй у плячах. Але па-ранейшаму ў яго баліць спіна і страўнік.

З бацькам яны шмат размаўлялі пра палітыку і пра Біблію. У некаторых выпадках спрачаліся. Але Дзіма вельмі пераканаўча пацвярджаў свой пункт гледжання. Каб не вера, не Біблія, то не ведаю, як бы ён там трымаўся. А цяпер ён у кожным лісце піша ўрывачак з Новага Запавета.

Вольга і Зміцер Дашкевічы.

Фота photo.bymedia.net

— Раскажыце, калі ласка, якім лідэр "Маладога фронту" быў у маленстве?

— Дзіма нарадзіўся, можна сказаць, у дарозе, — кажа бацька Вячаслаў Уладзіміравіч. — Мы летам 1982 года былі ў адпачынку ў родзічаў на Брэстчыне, потым на тыдзень заехалі на радзіму маці ў Гомельскую вобласць, у вёску Багуцічы, там ён і з'явіўся на свет.

— Дзіўна, што роды прымала тая самая лекарка Клара Львоўна, — дадае спадарыня Вольга, — якая мне самой дапамагала нарадзіцца. Мы з ёй разгаварыліся і ўспомнілі былое...

— А праз некалькі тыдняў мы зноў адправіліся ў Магадан, дзе я працаваў у газеце "Северная правда" загадчыкам эканамічнага аддзела, — працягвае гаспадар. — Праз пяць гадоў вярнуліся на Беларусь і пасяліліся на сталае месца жыхарства ў Старых Дарогах. Тут у мясцовай раённай газеце апошнія 16 год я быў адказным сакратаром. Мы з маці ўвесь час былі занятыя ў рэдакцыі, асаблівага часу на дзіця не было. Улетку ў адпачынку працаваў на жніве камбайнёрам, некалькі разоў выходзіў пераможцам.

Зміцер тут хадзіў у дзіцячы садок і пайшоў у школку. Ён быў жвавы і цікаўны хлопчык, настаўніца ў школе называла яго "залатым дзіцём". Былы дырэктар школы надрукаваў у газеце яго лепшае сачыненне. Аднойчы ён напісаў фантастычную аповесць. У яго добрая памяць, каб ён быў крышачку спакайнейшы, то і зусім бы выдатнікам быў. Любіў чытаць гістарычныя кнігі, доўгі час праводзіў з энцыклапедыямі, са слоўнікамі, займаўся задачкамі па арыфметыцы.

— Вы з Вольгай Васільеўнай — журналісты па адукацыі. Зміцер не захацеў пайсці па вашых слядах?

— Пасля школы ён атрымаў мэтавае накіраванне ў Гродзенскі сельскагаспадарчы інстытут на спецыяльнасць "заатэхніка". Але гэтая справа не прыйшлася яму па душы. Потым некаторы час працаваў на лесапільным заводзе, працаваў пільна, паслухмяна, не гультайнічаў, але ў душы маяўся і нечага шукаў. Нарэшце паехаў у Мінск, там пасяліўся з сябрамі, прадаваў з прадпрымальнікамі на кірмашы каву і гарбату. Да гэтага часу там пытаюцца: "А дзе тыя хлопцы, што па-беларуску прапаноўвалі гарбату?" Нарэшце ён паступіў у Віленскі педагагічны універсітэт на факультэт славістыкі, на беларускае аддзяленне, і быў вельмі рады.

— Дзіма досыць рэлігійны чалавек. Ён хрышчоны?

— Ён быў ахрышчаны ў праваслаўнай царкве. Дома ў Старых Дарогах кожны тыдзень на працягу двух гадоў хадзіў у нядзельную школу, вельмі любіў гартаць дзіцячую Біблію — яна ў яго самая зачытаная кніга. Калісьці яго бабуля пешшу за 40 кіламетраў хадзіла ў Жыровічы. Мусіць, гены спрацавалі.

Усё гэта ў яго было. А потым ён сустрэў Паўла Севярынца, і Бог яго павёў сваім шляхам, і мы за гэта ўдзячны. Цяпер вера ў яго вельмі моцная, яна зрабілася яго асноўным жыццёвым перакананнем. Ён далучыўся да вернікаў Пратэстанцкай царквы.

— А як вы ставіліся да яго дзейнасці ў "Маладым фронце"?

— Спачатку я не ўхваляў яго заняткаў палітыкай, але калі пабачыў, колькі людзей іх падтрымлівае — і маладых, і старых, то зразумеў, што гэта выпрацаваная грамадзянская пазіцыя.

Зміцер сказаў мне: "Я свядома абраў свой шлях і прайду яго да канца". У яго была магчымасць застацца ў Амерыцы, калі ён быў там летам мінулага года, ён мог з'ехаць вучыцца ў Польшчу, але яго цэльны характар падказаў яму, што ён як лідэр з'яўляецца маральным аўтарытэтам і павінен застацца на Беларусі.

— Як вы ставіцеся да факту завядзення новай крымінальнай справы на Зміцера?

— Гэта відавочны абсурд. Ён ужо год знаходзіцца ў турме, што ён можа ведаць, што сведчыць? Яны проста шукаюць на пустым месцы, як зладзіць новы працэс, каб не выпускаць лідэра моладзі на волю.

— Шмат людзей выступаюць у абарону Зміцера?

— Так. Нас наведвае шмат людзей, былі прадстаўнікі з Германіі, Чэхіі, АБСЕ, грамадскіх арганізацый, царквы. Мы рады, што ў Зміцера шмат сяброў. Яны пішуць яму лісты, дапамагаюць з перадачамі. Вернікі моляцца за яго. І мы не засталіся ў адзіноце, таму верым, што дачакаемся перамогі!

Эма ДЗВІНСКАЯ.

Зміцер у дзяцінстве.

АБЗАЦЕМ

У прокуратуры нет вопросов к Владимиру Коноплеву

После ухода **Владимира Коноплева** с поста председателя Палаты представителей в определенных кругах пошли разговоры о том, что он якобы попался на взятке размером чуть ли не в полмиллиона долларов. И что Владимира Николаевича даже приглашали на допросы в прокуратуру.

"Народная воля" попросила генпрокурора **Петра Миклашевича** подтвердить или опровергнуть эти слухи.

"Прокуратура не расследовала такого дела, — ответил Миклашевич. — *У нас его не было и нет в производстве. Если будет — мы вам сообщим".*

Дело трех полковников

Генпрокуратура продолжает расследование по делу о коррупционной деятельности группы сотрудников силовых структур.Следствие планируется завершить в этом году.

Напомним, что по делу проходят два полковника КГБ и полковник МВД. Они обвиняются в злоупотреблении служебными полномочиями и взяточничестве.

Их фамилии в прокуратуре не называют.

Полсотни таможенников под прицелом

Скандальное дело таможенников, похоже, будет длиться еще очень долго.

"Первый этап дела в отношении 22 лиц за нарушения при перемещении различных грузов и товаров через таможенную границу мы уже завершили, — сообщил Петр Миклашевич. — В настоящее время идет второй этап расследования. Мы снова выходим на значительное количество обвиняемых — где-то около 50 человек. Планируем, что второй этап этого дела завершится до конца этого года — в начале следующего. К сожалению, должен сказать, что, вероятно, еще будет и третий этап. Выявляется, что работала очень многочисленная организованная преступная группа, которая на протяжении длительного времени организовывала незаконное перемещение товаров и грузов через границу. К сожалению, в этой преступной организации участвовали как сотрудники таможни, так и сотрудники КГБ. А сейчас мы вышли и на сотрудников МВД..."

Виновные в витебских взрывах до сих пор не найдены

Расследование этого уголовного дела все еще продолжается.По словам генпрокурора, в ходе расследования к ответственности привлечен "не один десяток лиц, которые были связаны с незаконным обращением оружия, боеприпасов и так далее".

Среди них, как уже сообщала "Народная воля", — майор УКГБ по Витебской области **Андрей Демидов**. Однако его вина в причастности к витебским взрывам не доказана.

Марина КОКТЫШ.

ЁСЦЬ ПЫТАННЕ

«Унёсак былога віцэ-прэзідэнта ЗША Альберта Гора ва ўсталяванне міру не большы, чым унёсак Станіслава Шушкевіча»

Чаму беларусаў няма сярод нобелеўскіх лаўрэатаў?

У гэтым годзе ў ліку прэтэндэнтаў на прэстыжную ўзнагароду былі тры нашы суайчыннікі: народны паэт Беларусі Рыгор Барадулін, экс-старшыня Вярхоўнага Савета Беларусі 12-га склікання Станіслаў Шушкевіч і праваабаронца Алесь Бяляцкі. Усе засталіся без прэміі.



«Па неафіцыйных звестках я трапіў у лік фаварытаў»

Рыгор Барадулін два гады запар быў вылучаны на Нобелеўскую прэмію ў галіне літаратуры за зборнік "Ксты". Аднак ні ў мінулым годзе, ні зараз вялікаму паэту не пашчасціла, прэмію прысудзілі іншым знакамітым аўтарам. Адразу пасля нярадасных для Беларусі звестак са Швецыі сябра паэта пісьменнік Валянцін Тарас у інтэрв'ю Радыё Свабода зазначыў: *"У мяне ёсць інфармацыя, яна з розных крыніц, не вулічная. Адна з умоў падтрымкі кандыдатуры і забеспячэнне далейшага праходжання праз Нобелеўскі камітэт — што сярод тых, хто вылучае таго ці іншага аўтара, павінен быць нехта з лаўрэатаў Нобелеўскай прэміі".*

У гэтым сэнсе неблагі шанц на прэстыжную ўзнагароду меў не менш вядомы беларус Станіслаў Шушкевіч. Кандыдатам на суісканне Нобелеўскай прэміі Міру за 2007 год яго вылучыў лаўрэат гэтай жа прэміі 1983 года, экс-прэзідэнт Польшчы Лех Валенса. Падтрымалі ініцыятыву знакамітага паляка ўплывовыя асобы Беларусі і іншых краін свету.

Аднак шведскія акадэмікі прысудзілі прэмію Міру амерыканцу Альберту Гору і членам Міжурадавай групы экспертаў па змяненні клімату.

"Роспачы няма, — кажа Станіслаў Шушкевіч. — *Я ні ў якім разе не засмучаны тым, што застаўся без узнагароды. У нашай галіне быў 181 намінант і 43 арганізацыі, вельмі годныя канкурэнты. Напрыклад, былы кіраўнік Германіі Гельмут Коль і сусветна вядомая полька Ірэна Сандлер, якая ў гады вайны выратавала ад смерці тысячы яўрэйскіх дзяцей. Па неафіцыйных звестках, я трапіў у лік фаварытаў. І мне было вельмі прыемна.*

Акадэмікі прагаласавалі за былога віцэ-прэзідэнта ЗША Альберта Гора. Гэта вельмі прыстойны чалавек, я ведаю яго асабіста. У Гора была моцная група падтрымкі. Пытанні экалогіі сёння досыць актуальныя".

Станіслаў Шушкевіч не выключае, што і ў наступным годзе яго кандыдатура таксама будзе вылучана на прэстыжную прэмію. Ужо вядома, што да ініцыятывы Леха Валенсы намініраваць былога старшыню Вярхоўнага Савета Беларусі на "нобеля" далучыліся яшчэ некалькі вядомых міжнародных структур. Так што кола ўплывовых і сусветна вядомых асоб, падтрымаўшых кандыдатуру Шушкевіча, значна пашырылася.

— Я не губляю надзеі, — кажа Станіслаў Шушкевіч. — *Складана адказаць, чаму сярод лаўрэатаў прэміі няма беларусаў. Думаю, што беларусы не цягнуць пакуль што. Быкава, шкада, упусцілі. А Барадулін яшчэ можа пазмагацца.*

«Нам не хапае веры ў саміх сябе»

Філосаф Валянцін Акудовіч даўно задаўся пытаннем, чаму сярод нобелеўскіх лаўрэатаў няма беларусаў. У 2003 годзе ён напісаў эсэ "Чаму Васілю Быкаву не далі Нобелеўскай прэміі".

"Мая тэза такая, — кажа Валянцін Акудовіч. — *Пакуль мы самі не зразумеем сваю годнасць і годнасць тых беларусаў, якіх вылучаюць на Нобелеўскую прэмію, нам узнагароды не дадуць. Нам не хапае веры ў саміх сябе, веры ў тое, што сярод нас ёсць вартыя гэтай узнагароды людзі".*

"Сёлета Нобелеўскую прэмію Міру атрымаў Альберт Гор, — разважае філосаф. — *Але ці можна яго ўнёсак ва ўсталяванне міру лічыць больш значным за ўнёсак Станіслава Шушкевіча?!*

Так, праблемы экалогіі актуальныя, і тыя, хто імі займаецца, вартыя ўшанавання. Гор стварыў фільм пра праблемы глабальнага пацяплення клімату, адыграў значную ролю ў распрацоўцы і падпісанні Кіётскага пратакола. Усе гэтыя высілкі маглі паспрыяць у прасоўванні пэўных экалагічных ідэй. Але, уласна кажучы, экалогіяй сёння шмат хто займаецца, займаецца самаахвярна, для некаторых гэта справа ўсяго жыцця. У параўнанні з Горам Шушкевіч удзельнічаў у тых падзеях, якія сапраўды паўплывалі на сусветную гісторыю, сталі паваротнымі. Ён разваліў адну з самых злачынных у гісторыі чалавецтва імперыю, паставіўшы свой подпіс пад Белавежскім пагадненнем. Шушкевіч вывеў з Беларусі атамную зброю, паменшыў тым самым колькасць "атамных" дзяржаў.

Але мы не можам паверыць у тое, што гэтыя значныя падзеі заслугоўваюць Нобелеўскай прэміі. І, напэўна, палова Беларусі рагатала, калі б Шушкевіч атрымаў "нобеля". Мяркую, што нават сам Станіслаў Станіслававіч не можа паверыць у значнасць ім зробленага.

Таму я і лічу, што спачатку мы павінны паверыць у тое, што нашы людзі заслугоўваюць "нобеля". Заўважце, з нашай маленькай краіны за апошнія гады былі вылучаны на "нобеля" 5 чалавек па дзвюх намінацыях (крыху раней Васіль Быкаў і Святлана Алексіевіч). Алексіевіч, дарэчы, наколькі я разумею, з шорт-ліста намінантаў не выкраслена, і таму лічыцца кандыдаткай на ўзнагароду. Не думаю, што нават суседнія краіны, насельніцтва якіх значна большае, чым у Беларусі, могуць пахваліцца такой колькасцю кандыдатаў. На гэты феномен чамусьці не надта звяртаюць увагу. А ён надзвычай істотны. Ён яшчэ раз пацвярджае, што пад нашым нізкім шэрым небам дастаткова высокіх людзей".

Вольга ГРЫНЯВІЦКАЯ.

ВАС ЦІКАВІЦЬ...

Мікалай Скутаў магчыма датэрмінова выйдзе на волю

Паважаная "Народная воля"! Некалі вы пісалі пра былога дэпутата Палаты прадстаўнікоў Мікалая Скутава, якога асудзілі на сем год пазбаўлення волі. Можа, ён ужо выйшаў на волю? Калі не, ці трапіць ён пад амністыю?

Валянціна ІВАНКОВІЧ, Мінская вобласць.

Сапраўды, дэпутата Палаты прадстаўнікоў 2-га склікання некалькі гадоў таму Вярхоўны суд прызнаў вінаватым у махлярстве і незаконным удзеле ў прадпрымальніцкай дзейнасці.

У сваім апошнім слове былы дэпутат і бізнесмен назваў абвінавачванні на свой адрас несправядлівымі і "бязбожнымі". Дзяржаўны абвінаваўца прасіў, каб суд пазбавіў Скутава волі на 12 гадоў, але Скутаву прызначылі 7 гадоў калоніі ўзмоцненага рэжыму. На падставе амністыі, прымеркаванай да 60-годдзя Перамогі, экс-дэпутату "даравалі" 1 год.

Атрымаць нейкую інфармацыю пра Мікалая Скутава аказалася справай нялёгкай. Ягоная жонка ў тэлефоннай размове з рэпарцёрам "Народнай волі" прасіла не прыцягваць увагу да гэтай справы. Паведаміла толькі, што муж рэгулярна дасылае лісты дадому.

Былы адвакат Скутава Вера Страмкоўская не выключае, што пасля амністыі Мікалай Скутаў можа датэрмінова выйсці на волю.

Ірына МУРАЎЁВА.

РАБОТА НАД ОШИБКАМИ

По техническим причинам в материале "Как нужно правильно косить траву" ("Народная воля" №173—174 от 1 ноября) в отдельных случаях произошел сбой при написании прописных букв. Приносим свои извинения.

ДАРЭЧЫ

Працэдура прысуджэння Нобелеўскай прэміі лічыцца адной з самых цьмяных і непразрыстых. Ніхто не ведае крытэрыяў, па якіх акадэмікі выбіраюць лаўрэатаў. Стэнаграмы пасяджэнняў Нобелеўскага камітэта не вядуцца, лісткі з прозвішчамі кандыдатаў спальваюцца, зазірнуць у архівы аднаго канкрэтнага года можна толькі праз 50 гадоў. Невядома, як адбываецца галасаванне. Некаторыя аналітыкі зачыненасць нобелеўскай "кухні" прыраўноваюць да канфідэнцыяльнасці Ватыкана пры абранні новага Папы Рымскага.

Адны навукоўцы лічаць такі досвед правільным. Іншыя — катэгарычна не згодны. Аднак, мяркуючы па ўсім, у бліжэйшы час змен у правілах прысуджэння Нобелеўскай прэміі не адбудзецца.

Лаўрэатамі Нобелеўскай прэміі станавіліся прадстаўнікі 65 краін. Найчасцей — навукоўцы з ЗША (301 чалавек) і Вялікабрытаніі (114). З краін СНД і Балтыі "нобелі" ёсць толькі ў Расіі — 22 прэміі.

ЭТО БЫЛО...

Спектакль спецслужб в Пинске

Появление бывшего кандидата в президенты Республики Беларусь Александра Милинкевича в Пинске не было неожиданностью ни для кагэбистов, ни для работников милиции, ни для местных оппозиционеров. Только предприниматели рынка по улице Звездной — кто с удивлением, кто с восхищением — останавливали его, пожимая руку. Одна из торгующих, завидя Милинкевича издалека, на радостях бросилась ему навстречу и, приобняв, задала ошеломляющий вопрос: "А что, уже власть поменялась?" Другие, сдержанно наблюдая за происходящим, подозрительно оглядывались по сторонам: как бы не появилась милиция, а за ней и налоговая инспекция. Несколько раз останавливаясь, Милинкевич вместе с сопровождающими прошел центральный ряд. Здесь-то уже открыто и явно приклеился "хвост" из "правнуков железного Феликса" и людей в погонах, запугивая непрерывным разговором по сотовому и съемкой на видеокамеру. Как будто вот-вот нагрянут сотни спецназовцев вместе с автозаками, и всех окружающих постигнет судьба Захаренко, Гончара, Красовского, Завадского... Но никто не обращал на них особого внимания. Пройдя в цветочный ряд, Милинкевич более пятнадцати минут не мог продолжать путь, разговаривая с приветствовавшими его предпринимателями. Кто-то из сопровождавших предложил приблизившемуся милиционеру поговорить с Милинкевичем. Человека в погонах как ветром сдуло.

Купив на рынке венок, бывший кандидат в президенты направился на кладбище, что по улице Спокойной, где похоронены многие видные люди Полесья и где за пару месяцев до этого коммунальные службы города, занимаясь спиливанием старых деревьев, повалили ряд памятников.

Здесь, кроме добровольцев по восстановлению надгробий, уже были три сотрудника КГБ в штатском и один человек в погонах, прогуливающиеся по центральному проходу.

Экскурсия во главе с Милинкевичем и знатоками истории ходила по кладбищу от могилы к могиле, знакомясь с именами знаменитостей Пинска, тех, кто оставил добрую славу о себе в памяти полешуков.

Время бежало быстро, интерес к гостю из Минска и сопровождавшим его возрастал. Появившийся еще один милиционер, не решаясь подойти к экскурсии, бросился к добровольцам, работающим на кладбище, и переписал несколько фамилий, запугивая их тем, что поступила жалоба от "жильцов", что на кладбище очень шумно. В ответ ребята лишь недоуменно пожали плечами: мол, о какой жалобе вы, друзья, говорите, если до ближайших домов не менее 150 метров, да и мы работаем, а не песни поем. А может, жалоба поступила от жильцов реставрируемых могил?

Второй милиционер пытался с помощью матерщины спровоцировать инцидент с остальными добровольцами. У него ничего не получилось.

Под предводительством местных краеведов экскурсия по кладбищу проходила интересно и спокойно. Только две гладковыбритые личности, внедрившиеся в толпу, легко распознавались среди присутствующих по прищуренным, притворно равнодушным взглядам. Третий потомок деятелей НКВД время от времени издали снимал происходящее на видеокамеру, пытаясь хоть этим запугать присутствующих.

В конце концов, один из милиционеров осмелился приблизиться к экскурсии. На его глупое предложение всех переписать Милинкевич предложил: подгоните автозаки и арестуйте всех, а если мы нужны вашему начальству, то пусть оно само к нам приедет.

На центральном проходе кладбища уже стояла шестая модель "Жигулей". Внешний вид вышедших из машины, а также пренебрежительно-самоуверенный взгляд говорили о том, кто настоящий хозяин ситуации и в каких ведомствах эти люди получают свои солидные зарплаты. Барабанов, трещоток и хлопушек у посетителей кладбища не наблюдалось, все только улыбались и удивлялись: неужели в Пинске так сильно упала преступность, что силовым структурам от безделия нечем заняться в выходной день?

По завершению экскурсии толпа посетителей не спешила расходиться. Интересно было смотреть на спектакль, разыгрываемый силовыми структурами. Поблагодарив присутствующих и получив благодарность от них за внимание, оказанное нашему городу, Милинкевич, попрощавшись со всеми и подойдя к машине, обнаружил еще одно проявление изобретательности силовиков: хотя площадка для машин была свободна, его "Вольво" было подперто бортовой "Газелью", а водитель, спрятавшись за забором, выглядывал, ожидая указаний начальства, что ему дальше делать. Кстати, эта "Газель" была позже замечена во дворе отдела милиции.

В конце концов, две машины с Милинкевичем и его спутниками, сопровождаемые "хвостом" стукачей-осведомителей, направились в сторону знаменитого местечка Поречье. По пути как туда, так и обратно происходило натравливание гаишников на машину, в которой ехал Милинкевич. Все происходило под бдительным оком тех же кагэбистов, державшихся в пяти—десяти метрах поодаль.

В Поречье посетителей встретил довольно приятный в общении председатель сельсовета, который провел их к могиле Скирмунта и умело дополнил познания краеведов о почитаемом земляке. После обстоятельной беседы, возложения венка и фотографирования Александр Милинкевич направился в столицу, оставив без дела местных надзирателей.

Эдуард АВУЧ.

P.S. *Этот случай произошел не день, и не два назад, а еще в начале сентября. Но, к сожалению, ни в одной газете я не мог о нем рассказать, редакторы отказывались публиковать. В то же время я считаю, что каждый такой эпизод нужно доводить до широкой общественности. А потому и выражаю признательность "Народной воле" за предоставление своих страниц.*

Народная Воля http://www.nv-online.info
8 ЛІСТАПАДА 2007 г.

З ПОШТЫ ГАЛОЎНАГА РЭДАКТАРА

Хованкі пасля выбараў

Неўзабаве споўніцца год, як адбыліся выбары ў мясцовыя Саветы, у наступным годзе завершыцца тэрмін паўнамоцтваў дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу. У сувязі з гэтым хачу праз "Народную волю" выказаць набалелае: думкі пра тое, як дэпутаты розных узроўняў, дамогшыся свайго паважнага статусу, гуляюць у хованкі з выбаршчыкамі, тым самым грэбуючы абавязкамі перад імі і папіраючы законы.

Я раней лічыў, што ў дэпутаты ідуць людзі актыўныя, творчыя і смелыя. Яны мусяць ведаць жыццё свайго рэгіёну з усімі праблемамі і мець жаданне зрабіць гэтае жыццё лепшым — такім, якім яны яго малявалі нам у перадвыбарных прамовах. Тады кандыдаты разам са сваімі даверанымі асобамі па некалькі разоў на дзень сустракаліся з выбаршчыкамі. Здавалася, што яны гатовыя за народ жыццё аддаць — толькі б за іх прагаласавалі на выбарах.

Але варта было выбарам адбыцца, а дэпутатам — атрымаць паўнамоцтвы "слуг народа", як актыўнасць гэтых людзей некуды знікла, а самі яны недзе схаваліся.

Вось я і хачу паказаць гэтую дзіўную метамарфозу на прыкладзе нашага мікрараёна ў Паставах, дзе знаходзіцца былы вайсковы гарадок №6, які належыць да 12-й і 13-й выбарчых округ. Мы, жыхары гэтага мікрараёна, абралі па дзвюх округах дэпутатаў розных узроўняў — ад Вярхоўнага Савета да мясцовых органаў улады. У час перадвыбарнай кампаніі яны ўсе былі навідавоку. А вось пасля выбараў зніклі з нашых вачэй, і мы не ведаем, як працуюць яны над выкананнем сваіх перадвыбарных праграм.

Даведацца пра гэта можна было б, скажам, на прыёмах па асабістых пытаннях або на сустрэчах з выбаршчыкамі ў час сходаў ці сустрэч у калектывах.

Ды вось бяда — сустрэчы такія не праводзяцца, а калі і зрэдку праводзяцца, то ніякай інфармацыі да мяне, як да выбаршчыка, не даходзіць. Людзі, якія перад выбарамі кляліся ў любові да народа, атрымаўшы ад народа пэўную колькасць галасоў, страцілі да яго цікавасць.

Тут, выбачайце, узгадваецца слова "душахваты", якім у часіны сярэднявечча нашы продкі называлі рэлігійных прайдзісветаў, што падманамі і абяцаннямі хуткага шчасця ўцягвалі ў свае секты даверлівых людзей.

Ці ж не гэткімі "душахватамі" выглядалі на перадвыбарных сходах цяперашнія дэпутаты? Для іх галоўным было абрацца, а потым — хоць трава не расці.

Вядома, сустрэцца з кожным з іх асабіста няцяжка. Прыкладам, дэпутат Палаты прадстаўнікоў Ванда Фердынандаўна Януковіч час ад часу вядзе ў сваім кабінеце прыём грамадзян па прыватных пытаннях. Але прыём не можа вычарпаць усіх пытанняў, якія хвалююць людзей, на прыёме не даведаешся, якімі справамі займаюцца дэпутаты вышэйшага ўзроўню, якія законы рыхтуюць, як змагаюцца за народныя інтарэсы. Для такога шырокага спектра пытанняў патрэбна была б сустрэча В.Януковіч з вялікай аўдыторыяй. Але ніводнага сходу, на якім бы выбаршчыкі маглі паставіць перад Вандай Фердынандаўнай канкрэтныя пытанні, за час, што мінуў пасля выбараў, я не ўзгадваю.

Не ладзяць сустрэч з выбаршчыкамі і дэпутаты мясцовых Саветаў, абраныя ў нашым мікраёне. Калі я думаю, чаму яны не хочуць сустракацца з намі, то прыходжу да высновы, што тут могуць быць дзве прычыны: першая — ім няма пра што гаварыць з людзьмі, бо яны нічога не робяць для выканання сваіх перадвыбарных абяцанняў. Другая магчымая прычына — яны не ведаюць, што сваім нежаданнем сустракацца з народам парушаюць законы. У прыватнасці — Закон "Аб статусе дэпутата Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь" ад 8.10.1998 г., у артыкуле 26 якога напісана: "Дэпутат адказны перад выбаршчыкамі і ім падсправаздачны". А далей у законе гаворыцца, што "дэпутат... абавязаны рэгулярна, не радзей аднаго разу на год, праводзіць справаздачы перад выбаршчыкамі". Тлумачыцца ў законе і тое, навошта патрэбны гэтыя справаздачы: каб дэпутат распавёў выбаршчыкам пра сваю працу па выкананні перадвыбарнай праграмы, патлумачыў, чым займаецца дэпутацкі корпус, членам якога ён з'яўляецца. Закон патрабуе, каб інфармацыя аб маючых адбыцца справаздачах перадавалася па мясцовым радыё, публікавалася ў мясцовых газетах.

У законе прадугледжаны і формы працы дэпутата з выбаршчыкамі: сходы, сустрэчы з працоўнымі калектывамі, прыёмы грамадзян.

Часам, праўда, можна пачуць такое меркаванне: дэпутатамі, маўляў, з'яўляюцца ў большасці кіраўнікі, а яны — людзі надта занятыя, ім бракуе часу на сходы і сустрэчы.

Смешна і сорамна чуць гэткія апраўданні дэпутацкай абыякавасці да закону. Як бы ні быў заняты дэпутат-бюракрат, аднойчы ў паўгода, да таго ж — увечары, час для сустрэчы з выбаршчыкамі знайсці можна любому начальніку. Тым больш што гэтая сустрэча прынясе карысць яму самому: падкажа вузкія месцы ў працы, вызначыць напрамкі дзейнасці.

Пры вялікім жаданні я, безумоўна, магу прыйсці на прыём да той жа В.Януковіч, знайсці спосаб сустрэцца з дэпутатам абласнога Савета па нашай акрузе — старшынёй сельскагаспадарчага кааператыва "Камайскі" Валянцінам Пылінскім, магу выстаяць чаргу перад кабінетам дырэктара школы №3 у Паставах, дэпутата райсавета Юрыя Кісялёва ці сустрэць на вуліцы ягонага калегу па дэпутацкім корпусе, камандзіра вайсковай часці Валерыя Гарачку. Так, усё гэта я магу зрабіць.

Але чаму я, выбаршчык, павінен чакаць і шукаць сустрэчы з людзьмі, якія лічацца "слугамі народа"?

Чаму я, частка гэтага народа, мушу нагадваць дэпутатам пра іх абавязкі перад законам і людзьмі?

Мяркую, што неўзабаве цярпенне выбаршчыкаў лопне, і яны пачнуць аднаго за другім адклікаць дэпутатаў з высокіх пасад за абыякавасць да сваіх абавязкаў і грэбаванне законам.

Улічваючы вялікія дэпутацкія заробкі, у выніку такой "чысткі" парламента і скарачэння месцаў у Саветах карысць будзе для ўсіх: казна атрымае эканомію, неадкліканыя дэпутаты, нарэшце, зоймуцца справай, а тыя, хто застанецца без дэпутацкага статусу, няхай, як усе, пашукаюць працоўнае месца.

Уладзімір БАРОЎКА,
ветэран Узброеных сіл Рэспублікі Беларусь.

г.Паставы.

ЧАМУ?

Сыходзяць майстры...

Яшчэ год пятнаццаць-дваццаць таму можна было ўбачыць у нашых вёсках, як позняй восенню і ўзімку жанчыны шчыруюць за калаўротамі і кроснамі: прадуць ніткі з лёну ці воўны, ткуць дзівосныя ўзорныя тканіны. Праз нейкі час здатныя майстрыхі рабілі ў сваіх хатах багатыя выставы плёну ўласнай працы: развешвалі неверагодна прыгожыя ручнікі, раскладвалі вышытыя абрусы, тканыя посцілкі і палавічкі. Гэта было не проста маляўнічае відовішча, а сапраўдная радасць і свята народных талентаў, якія сваёй карпатлівай працай і творчай фантазіяй, тонкім густам і перайманнем умельства мацярок і бабуль упрыгожвалі сціплы сялянскі побыт, ператваралі звычайны пакой у казку...

Зараз з сумам заўважаеш: сыходзяць адна за адной нашы майстрыхі, а сакрэты свайго самабытнага мастацтва забіраюць з сабой. Не таму, што не жадаюць дзяліцца гэтымі сакрэтамі, а таму, што іх няма каму перадаць. Свае дочкі часцей за ўсё даўно з'ехалі з роднай вёскі, а многія мясцовыя клубныя работнікі захаванню і развіццю неацэннага пласту традыцыйнай народнай культуры мала аддаюць увагі. Падобна, гэтак жа мала гэта цікавіць і адпаведныя кіруючыя органы.

Праўда, час ад часу чуеш: то тут, то там праходзяць выставы народнай творчасці. Але — далекавата ад нас. І што пасля іх? Часцей за ўсё вясковыя мастакі аказваюцца сам-насам са сваімі праблемамі і сваімі, нікім не запатрабаванымі творамі. Вось каб выставы-конкурсы ладзіліся на пастаяннай, рэгулярнай аснове, ды яшчэ са стварэннем шырокай магчымасці ўмельцам рэалізоўваць свой тавар. Але такую магчымасць, падобна, калі і маюць, то далёка не ўсе, хто здатны дарыць людзям талент і радаваць іх, аздабляць сваім шчодрым дарам жыццё.

Мне давялося пабываць у Польшчы на Беласточчыне, пазнаёміцца ў горадзе Бельск-Падляскі з адной сям'ёй. Пётр і Валянціна Трац займаюцца вырабам розных сувеніраў — даволі цікавых, але, як мне падалося, усё ж менш цікавых, чым творы многіх нашых майстроў. На пытанне, ці маюць попыт іх вырабы, гаспадары задаволена адказалі: так, маюць. У Польшчы і суседніх краінах штогод ладзяцца выставы-кірмашы, падчас якіх не толькі ідзе бойкі гандаль работамі народных умельцаў, а і заключаюцца здзелкі-заказы на такія тавары. Яны пастаўляюцца ў Швецыю, Фінляндыю і іншыя краіны, знаходзяць там свайго пакупніка.

Адметныя сувеніры паказвалі мне ўкраінскія разьбяры па дрэве на Львоўшчыне і Валыншчыне — іх ведаюць, даюць ім дарогу. Здорава! А чым мы, беларусы, горш? Чаму ж наша Міністэрства культуры, Беларускі саюз народных майстроў разам з Беларускім тэлебачаннем не парупяцца, каб больш шырока арганізаваць канкрэтную дапамогу ўмельцам у рэалізацыі і папулярызацыі іх твораў? Напэўна, і моладзь тады б не лічыла гэты занятак не вельмі сур'ёзным: маўляў, гэтай справай на жыццё не заробіш.

Ёсць у мяне асабістае захапленне — у вольны час займаюся калекцыянаваннем рагоў дзікіх жывёлін, разьбой па косці. А вось што далей рабіць, не ведаю...

Іван БАРЫСІК,
жыхар г.Слоніма.

МАРТЫРАЛОГ

Крыжовыя дарогі людскіх лёсаў

Іншы раз і бяссонніца бывае рэч карысная. У адну з такіх начэй пачаў лістаць трапіўшую мне ў рукі дакументальную кнігу Л.Маракова "Ахвяры і карнікі". Перагортваючы старонку за старонкай, падумаў: ці не знайду я тут імя свайго крэўнага, што ў канцы 20-х ці пачатку 30-х гадоў мінулага стагоддзя, шукаючы паратунку ад пераследу польскіх улад, уцёк у Савецкі Саюз і там недзе без следу знік.

Як вядома, у той час у СССР ішло "паляванне" на рознага роду шпіёнаў, дыверсантаў, здраднікаў ды іншых "ворагаў народа" і зламыснікаў.

Аб падзеях таго часу ў прэзідэнцкім архіве Расійскай Федэрацыі захоўваецца шмат дакументаў. У тым ліку "Списки лиц, подлежащих суду военной коллегии Верховного Суда СССР", датаваныя 7 верасня 1937 года і падпісаныя І.Сталіным, В.Молатавым, Л.Кагановічам, К.Варашылавым і М.Яжовым, а таксама 15 верасня 1937 года, падпісаныя І.Сталіным, В.Молатавым і начальнікам 8-га аддзела ГУДБ СССР старшым маёрам дзяржбяспекі У.Цасарскім. У іх пералічваюцца сотні жыхароў тагачаснай Беларусі, якія падлягалі суду, а прасцей — знішчэнню. Па першым спісе было расстраляна 103 чалавекі. У другім — іх многія сотні. Расстрэлы выконваліся ва ўнутранай турме НКВД у Мінску. Расстрэльная машына працавала бездакорна, нават без выхадных. У нядзелю 20 лютага 1938 года была расстраляна 141 асоба. Калі канвеер карнікаў працаваў круглыя суткі без перапынку, то кожныя 10 хвілін развітваўся з жыццём і чалавек!

Менавіта ў другім спісе я і знайшоў свайго крэўнага. Гаворка тут ідзе пра дваюраднага брата маёй маці, былога жыхара вёскі Сялец Лідскага раёна Шэшка Іосіфа Сільвестравіча. На старонцы 156 кнігі чытаю: *"Шашко Іосіф Сільвестравіч (1902), навуковец, аграном, педагог. Арыштаваны 28.8.37. Асуджаны 20.10.37"*. Расстраляны ва ўнутранай турме НКВД БССР 10 лістапада 1937 года.

Некаторая недакладнасць у напісанні прозвішча — Шашко замест Шэшка — вынік недакладнага перакладу з беларускай мовы на рускую ці наадварот.

Да арышту ён працаваў выкладчыкам Горацкай сельскагаспадарчай акадэміі, меў навуковую ступень кандыдата сельгаснавук.

У той дзень былі расстраляны 16 чалавек. У тым ліку: 9 калгаснікаў, адзін рабочы і адзін дзяржаўны служачы, адзін аднаасобнік і два навукоўцы. Астатнія дзве асобы — невядомых прафесіі і роду заняткаў.

Такі ж лёс мог напаткаць і яшчэ аднаго майго сваяка — роднага брата маёй маці, а майго дзядзьку — Шэшку Юліяна Якаўлевіча. Таксама жыхара вёскі Сялец. Польскімі ўладамі ён быў асуджаны да пакарання смерцю. Але здзейсніўся цуд — зняволены ўцёк з-пад варты і таксама пабег у СССР. А там яго толькі і чакалі: за каўнер — і як польскага шпіёна пагналі ў канцлагер ГУЛАГа ў Іркуцкую вобласць.

Ды і там уцёк. Ледзь прытомнага знайшлі яго ў тайзе мясцовыя жыхары. Адагрэлі, далі прытулак і сталі жыць разам. Шмат гадоў пражыў пад чужым прозвішчам. І толькі пасля вайны стаў, як сёння кажуць, "легітымным" грамадзянінам Расіі. Зараз жыве там ягоная сям'я, з якой я падтрымліваю добрую і ўстойлівую сувязь — пісьмы, тэлеграмы, тэлефонныя размовы.

Усё б нішто, калі б злы лёс, бы той дамоклаў меч, не вісеў над галовамі гэтай сям'і і цэлага роду.

У 1941 годзе пачалася Вялікая Айчынная вайна. У Сялец прыйшлі нямецка-фашысцкія захопнікі. Па нечым брудным даносе арыштавалі бацькоў Іосіфа — Шэшку Сільвестра. І 23 ліпеня 1941 года разам з іншымі аднавяскоўцамі расстралялі. Здаецца неверагодным, каб такое магло здарыцца. Ён жа быў усяго калгаснікам толькі што створанага калгаса. Меў стары ўзрост. Працаваў калгасным пастухом. Не быў ні камуністам, ні іх прыхільнікам. Хутчэй наадварот.

У асабістых гутарках шмат хто з маіх апанентаў, перш за ўсё пракамуністычна настроеных, кажуць: не трэба варушыць мінулае. Усё прайшло, і пра яго трэба забыцца. Маўляў, гісторыя не паўтараецца. А ці так гэта на самай справе? Калісьці Марк Твен казаў: на свеце няма нічога такога, што не магло б здарыцца. Уся гісторыя як сукупнасць падзей мінуўшчыны паўтарыцца, натуральна, не можа. Затое асобныя падзеі ў змененым стане ў залежнасці ад часу паўтараюцца ў не менш жудасным выглядзе. Прыкладаў таму мноства.

Ці не была паўторам "Варфаламееўскай ночы" 24 жніўня 1572 года "Крышталёвая ноч" 24 лістапада 1938 года ў фашысцкай Германіі?

Ці не паўтарыў Гітлер у XX веку "досвед" уладароў Венецыянскай Рэспублікі (зараз — Італія) XIV—XV стагоддзяў, ствараючы жудасныя гета? Назва "гета" мае італьянскае паходжанне.

Ці не паўтарылі сваімі дзеяннямі гісторыю інквізіцыі Гітлер са Сталіным: першы — вынішчаючы камуністаў і іх ідэалогію, другі — антыкамуністаў?

Па размаху сваіх злачынстваў яны кожны ў асобку пераўзышлі вядомага іспанскага інквізітара Тарквемаду, які знішчыў 111.511 ерэтыкаў. Большасць з іх спаліў жывымі на кастрышчы. Гітлер са Сталіным загубілі мільёны душ!

Не! Памятаць пра мінуўшчыну патрэбна. Мала таго, праз увесь час трэба нагадваць аб ёй сваім нашчадкам. Бо мінуўшчына — базіс, аснова будучыні. А я вельмі не хацеў бы, каб нашы нашчадкі і іх пакаленні жылі ў сваім новым доме, ці нават у хатцы, пабудаванай на падмурку, прасякнутым крывёю продкаў.

Тэрор улады небяспечны яшчэ і тым, што ён вынішчае лепшую, найбольш актыўную і працаздольную частку нацыі. Каб адрадзіць яе, спатрэбіцца шмат часу. Акрамя таго, ён наносіць грамадству непапраўны маральна-псіхалагічны ўрон.

Анатоль КУЛЕШ, жыхар г.Ліда.

РОЗДУМ НАД ФАКТАМ

Здароўе на экспарт

Нагодай для гэтых нататкаў стаў такі факт. Санаторый "Лётцы", што пад Віцебскам, набыў, можна сказаць, міжнародны статус: атрымаў ліцэнзію і дазвол Міністэрства аховы здароўя на абслугоўванне замежнікаў. Вядома ж, за грошы.

Галоўны ўрач санаторыя Сяргей Усялёнак лічыць, што дзейнасць ягонай установы ў гэтым напрамку карысная і паспяховая. Ён прыводзіць лічбы, якія сведчаць аб станоўчай дынаміцы абслугоўвання іншаземцаў. Летась у "Лётцах" пралячыліся 7313 беларусаў, 840 грамадзян дзяржаў СНД і 14 грамадзян з краін дальняга замежжа, якім у санаторыі лічаць краіны Балтыі.

За 8 месяцаў бягучага года паказчыкі палепшыліся: пралячылася 5900 беларусаў, грамадзян з краін СНД — 823 (або амаль столькі, колькі за ўвесь мінулы год), а гасцей з краін Балтыі было ўжо 269. С.Усялёнак паведаміў, што да іх пачалі прасіцца і жыхары Ізраіля.

Мне гэта падалося дзіўным, бо ізраільскія курорты маюць сусветную вядомасць.

— Усё проста, — патлумачыў Сяргей Паўлавіч. — Там адно месца каштуе больш за тысячу долараў на месяц, а ў нас — нашмат менш. Пуцёўка гарантуе камфорт, дыету і лячэнне, адпаведнае міжнародным стандартам. Вось людзі і выбіраюць, дзе ім будзе лепш. Сапраўды, выдаткі на знаходжанне ў "Лётцах" для замежнікаў з іх высокімі заробкамі ўяўляюцца проста "халявай".

Адзін дзень у нумары "люкс" (гасцёўня, спальня, санвузел, шыкоўная мэбля, тэлевізар) грамадзяніну Расіі абыходзіцца ў 28 долараў за суткі, а паляку — у 32 долары. Пры жаданні госць можа абмяняць валюту і заплаціць беларускімі рублямі (праўда, гэтае права распаўсюджваецца толькі на расіян).

Так што галоўная прывабнасць "Лётцаў" — у іх таннасці. Тое, што не па кішэні большасці нашых суайчыннікаў, не з'яўляецца сур'ёзным выдаткам для тысяч расіян, не кажучы ўжо пра грамадзян Польшчы, Латвіі, Эстоніі.

Праўда, госці з краін Балтыі — пакуль што рэдкая з'ява ў "Лётцах". А з Расіі едуць у асноўным не жыхары буйных гарадоў, а жыхары правінцыі, запатрабаванні якіх мала чым адрозніваюцца ад нашых. Аднак заробкі там, відаць, вышэй, бо нашага правінцыяла ў санаторыі сустрэнеш гэтак жа рэдка, як госця з Масквы, Рыгі або Варшавы, жыхары якіх прызвычаіліся адпачываць і папраўляць здароўе як мінімум у Сочы, а то і на Канарах.

Гэтым людзям у "Лётцах" не спадабаецца нават за самыя "смешныя" грошы. Мой сябар, які нядаўна лячыўся ў "Лётцах" па бясплатнай пуцёўцы (ён, інвалід II групы, чакаў яе некалькі год), выказаў незадаволенасць харчаваннем, побытам і абмежаванасцю медыцынскіх працэдур.

Нават калі ў яго былі празмерныя патрабаванні, не забудзем, што ён лячыўся бясплатна. Тыя, хто набыў пуцёўкі за наяўны кошт, будуць куды больш патрабавальнымі. Асабліва, калі бачылі нешта лепшае.

Доктар С.Усялёнак не без гонару засведчыў, што апошнім часам з'явілася надзея на прыезд пацыентаў з сапраўднага дальняга замежжа. У прыватнасці, нядаўна атрыманы замовы на пуцёўкі з Чэхіі, Ірландыі.

Заўважым, што дзве гэтыя краіны — не самыя заможныя ў Еўропе, а іх грамадзяне — не надта спешчаныя. Але яны, заплаціўшы за адпачынак з лячэннем паўтысячы і болей долараў, хутчэй адзначаць хібы ў абслугоўванні, чым пацыент з нашага Лепеля або рабочага мястэчка ў Смаленскай ці Карэльскай глыбінцы. Ад прэтэнзій чэхаў або ірландцаў не адмахнешся!

З аднаго боку, прысутнасць у "Лётцах" іншаземных пацыентаў — з'ява станоўчая: цвёрдая валюта для Беларусі — не лішняя. Ды і ўзровень абслугоўвання пад пільнымі позіркамі замежнікаў давядзецца ўзнімаць.

Але ў гэтай сітуацыі ёсць і другі бок. Варта паварушыць у галаве згаданымі лічбамі, як будзе зразумела, што колькасць замежных пацыентаў расце хутчэй за колькасць беларусаў. Што, рабочым нашых заводаў, фабрык не трэба папраўляць здароўе? Трэба, але як жа ты яго паправіш, калі многія сем'і ледзь канцы з канцамі зводзяць.

...Яшчэ больш праблематычна купіць пуцёўку ў тыя ж "Лётцы" звычайнаму настаўніку, доктару, культработніку.

А пенсіянерам? Тым, у каго пенсіі і нават пасля апошняга павышэння будуць на ўзроўні 300—320 тысяч рублёў, пра "Лётцы" можна канчаткова забыць. А тыя пенсіянеры, каму Лукашэнка паклаў два і болей мільёны, хутчэй паляцяць у Сочы альбо ў Турцыю, чым пад Віцебск.

Удумаешся ва ўсё гэта і адчуеш, што табе, як таму кіношнаму мытніку Верашчагіну, за дзяржаву крыўдна.

Крыўдна за нашых працавітых і бязмежна цярплівых людзей, якія моўчкі глядзяць на зграю бюракратаў і гурт "палатнікаў", што вершаць наш лёс, атрымліваючы за свае часцяком бязглуздыя рашэнні вялікія грошы, якія самім ім, вядома ж, дазваляюць адпачываць на славутых курортах. Лечацца ж яны, як у свой час наменклатуршчыкі КПБ, у спецустановах.

Так, гэта добра, што да нас на ляченне будзе ехаць усё больш і больш замежных гасцей. Але ж нам, беларусам, трэба дбаць у першую чаргу пра ўласнае здароўе. І санаторый "Лётцы" павінен быць даступны для кожнага жыхара краіны, якому неабходна папраўіць здароўе.

Сяргей БУТКЕВІЧ,
пенсіянер,
жыхар г.Віцебска.

БЕЗ РЕТУШИ

Одни откупаются, другие отправляются в тюрьму

Прочитала заметку о том, что А.Лукашенко освободил от судебного преследования 22 человека, которым вменялись разные нарушения экономического характера. В этот список попали те, кто возместил ущерб. А кто е го может возместить? На мой взгляд, только коррупционер или чиновник. Если их и поймали на какой-нибудь взятке или незаконной сделке, то будьте уверены, что они у многих из них не первые и, могу предположить, не последние. Несомненно, у них есть чем возместить, так как не последнее отдают, а еще останется не только на хлебушек с икоркой.

Почему тогда рабочего, который украл деталь на заводе, или колхозника, взявшего мешок зерна, не освободить при условии возмещения стоимости похищенного? На практике все наоборот. Тут им припаяют "и группу, и посягательство на госимущество" и т.д. В таких случаях наши суды расправляются быстро, не очень утруждая себя, вынесением суровых приговоров. Мол, а что с этой нищетой возиться, что с них возьмешь?

Я не оправдываю воровство в любом его проявлении. Но не надо делать хорошую мину при плохой игре.

Все знают, что у нас тот пан, у кого деньги, значит, и амнистии — для имущих.

Пенсионерка,
бывшая простая
работница фабрики.

ГОЛОС СОСЕДЕЙ

«Учиться уважению...»

"Объединения в единое государство я не хотела бы. Увы, история показывает нам, что империи нежизнеспособны: Рим, Австро-Венгрия, СССР, Югославия... Государства, основанные на национальном самосознании, более стойкие, даже если они совсем маленькие. Они — более самобытны и интересны для всех. Можно сколько угодно говорить о наших общих корнях. Но ведь и с поляками, и с болгарами, и со словаками у нас тоже общие славянские корни. Почему же они не объединяются? А главное — не враждуют? Живут нормально, цивилизованно, берегут свой язык, свою культуру, свою самобытность. Надо не объединяться в одно государство, а учиться цивилизованной дипломатии, общению на равных, уважению друг друга. Надо познавать культуру и языки своих соседей... В белорусах мне нравится трудолюбие, основательность, неторопливость, аккуратность, сдержанность. Не нравится — пренебрежение к своему языку, к своей самобытности. Ведь как каждый человек — единственный и неповторимый (даже близнецы), так и неповторим каждый народ. Я считаю, что языковая ситуация в Беларуси очень плохая. Впрочем, в Украине долго было то же самое. А сейчас стало престижно говорить по-украински. И хотя в наших восточных областях многие плохо владеют украинским языком, одно то, что Янукович заговорил по-украински, говорит о многом. По этому поводу есть замечательное высказывание: "Человек, не владеющий языком народа, среди которого проживает, — либо гость, либо захватчик". Я люблю украинский язык, хотя считаю себя русскоязычной. Официально я принципиально общаюсь по-украински даже с русскоязычными чиновниками. Если кто-то меня не понимает, пусть нанимает переводчика. Я — у себя дома. Я — не гость и не захватчик. Но я — не националист, экстремизм мне чужд. Белорусский язык я тоже обожаю. Ну как не восхититься нежным словом "вёска"! Легко читаю белорусские газеты, понимаю тексты мелодичных песен и размеренную белорусскую речь...

Нина КРАВЕЦ,
бухгалтер, г.Харьков.

ОТ РЕДАКЦИИ

Это письмо харьковчанки Нины Кравец, напечатанное в газете "Труд", один наш постоянный читатель предложил опубликовать на страницах "Народной воли". Считаем, что предложение вполне резонное. Это письмо как нельзя лучше разоблачает демагогию тех белорусских политиков, которые, прикрываясь пролоббированным законом о двуязычии, фактически поставили родной язык на грань вымирания, лишая нацию самобытности. Действительно, у нас общие славянские корни со многими народами, так почему мы должны объединяться только с Россией? Как мудро заметила Нина Кравец: "Надо не объединяться в одно государство, а учиться цивилизованной дипломатии, общению на равных, уважению друг друга..."

Народная Воля http://www.nv-online.info
8 ЛІСТАПАДА 2007 г.

Дама с косой

Своей популярностью Юлия Тимошенко во многом обязана знаменитой прическе

Американские журналисты уверены: рейтинг "оранжевой принцессы" Юлии Тимошенко во многом зиждится на ее волосах, точнее — на фирменной прическе революционерки. Знаменитый "бублик" якобы не только усиливает харизму "неистовой Юлии", но и делает лидера БЮТ узнаваемой в глазах избирателя, роднит "со всем украинским" и даже вызывает ассоциации с православным ореолом святых. Причем расти коса стала почти одновременно с рейтингом Тимошенко.

Сила Юлии Тимошенко, как у библейского пророка Самсона, кроется в волосах, уверено издание The New York Times. Прическа пани Юлии была охарактеризована как "манифест украинскому народу".

Ее знаменитый "бублик" стал не только "данью моде, Тимошенко же и созданной", но и символом "приверженности Украине". Это "значительно отличает" лидера БЮТ от ее оппонентов, провозглашающих "прозападный" или "пророссийский" курс развития Украины. Более того, закрученная вокруг головы коса напоминает изданию "ореол православных святых, изображаемый на иконах".

Одним словом, успех БЮТ на выборах в Раду и личный рейтинг кандидата в премьер-министры, достигающий, согласно соцопросам, 30%, во многом предопределены именно "патриотической прической" "леди Ю". И в дальнейшем, считает газета, знаменитая коса будет только способствовать росту популярности Тимошенко.

К слову сказать, рейтинг Юлии Владимировны и любовь народная к ней росли параллельно с косой. Впервые "бублик" на голове Тимошенко украинские избиратели могли оценить в 2001 году. Тогда, только выйдя из СИЗО, куда "дивчину" поместили по подозрению в коррупции, Тимошенко впервые заплела косу в форме "корзинки" и перевоплотилась из худощавой брюнетки в "украинскую Жанну д'Арк".

Ко времени "оранжевой революции" "корзинка" успела дорасти до нынешнего "каравая". Причем прилюдно свою

косу Тимошенко распускала считанное число раз — по нескольким торжественным (свадьба дочери) и траурным для себя (подписание правительством Виктора Еханурова газового договора с Россией) поводам. Последний случай пани объяснила банальной "нехваткой времени", так как "коса — это уже состояние души".

В своих интервью "оранжевая принцесса" не раз выражала свое глубокое удовлетворение тем, что "эта прическа стала предметом неослабевающего внимания в Украине". Что характерно, Тимошенко не лукавит. Вскоре после того, как президент Ющенко попросил свою бывшую соратницу с поста премьер-министра, пани Юлия появилась в Верховной раде с распущенными волосами, и эта новость сразу закрепилась в топах как украинских, так и российских информагентств. Мало того, прокомментировать эту временную смену имиджа решились ведущие лица украинской политики. О дизайнерах и модельерах даже говорить нечего.

В интервью газете The Jerusalem Post Тимошенко вообще заявила, что гордится своими волосами, благо они "оставили след во всевозможных околомодных кругах Европы". А пресс-служба БЮТ с удовольствием отмечает, что "национальная украинская коса" теперь украшает участниц недель моды в Париже и Милане.

Действительно, с "бубликом" на голове в 2005 году активно щеголяли модели Givenchy, примерно в то же время газета Daily Telegraph назвала его "модным трендом". Аналогичную прическу стали носить актрисы Сиенна Миллер и Пенелопа Крус. Звезда R'n' B Мэри Джей Блидж с абсолютно идентичным "караваем" красуется на обложке своего последнего альбома.

В июне 2005-го Юлия Владимировна была названа "человеком месяца" по версии польского издания журнала Playboy. Знаменитую прическу журналисты издания нашли "сексуальной". К тому моменту ее уже носили многие американки, которые вообще ничего не знали о революции в Украине и лишь переняли понравившийся им стиль Тимошенко. Модные издания тех лет рекомендовали украшать сей девайс "ленточками, крабиками и шпильками со стразами".

Добралась "бубличная" мода и до России. В модном салоне "Вязис" корреспонденту подтвердили, что в 2005-м и 2006 годах "каравай" был "суперписком" всех выпускных вечеров. "Коса Тимошенко, во-первых, ей идет, а во-вторых, стала уже неотделимой частью имиджа, как ранняя седина Клинтона или борода Фиделя Кастро", — сообщила одна из сотрудниц салона.

Пани Юлия отмечает, что ее коса — "персональное личное изобретение", и "ни один пиарщик этого себе приписать не может". Впрочем, при большом желании аналогичный "каравай" можно припомнить на головах у многих — от Леси Украинки до принцессы Леи из "Звездных войн".

Но факт остается фактом: лидер блока имени себя хронически старается появляться на публике только с "национальной прической", в то время как, по словам ее личного дизайнера Айны Гассе, в своем офисе и дома частенько ходит "с распущенными".

Да и попиариться на своей косе Юлия Владимировна любит. Беседующим с ней журналисткам она не раз предлагала "научить заплетать такую же", а однажды даже рассказала анекдот. Герои бурлеска, в которых четко угадываются Ющенко и Янукович, называют косу пани Юлии "кермо держави", то есть рулем государства.

Д.БАВЫРИН,
"Взгляд".

ФОТОВЗГЛЯД

Йеменские женихи — участники массовой церемонии, на которой узы брака заключили около 250 пар за счет фонда старшего сына президента страны.

Женщины ждут прилета в Камбоджу высокого гостя.

ИХ НРАВЫ

Скандал из-за поцелуя

История, начавшаяся с поцелуя в стокгольмском баре, вылилась в большой конфуз для правительства Швеции: об отставке объявила Ульрика Шенстром, помощник государственного секретаря, высокопоставленный советник премьер-министра.

Шведский таблоид Aftonbladet опубликовал фотографии, на которых Шенстром пьет вино и целуется с Адресом Пилбладом, политическим обозревателем телеканала TV4. Оппозиция и пресса подняли по этому поводу большой шум: недоброжелатели премьера утверждали, что советница в это время находилась при исполнении служебных обязанностей.

Пилблад впоследствии подтвердил, что они выпили "по несколько стаканов вина", но не стал уточнять, сколько именно. Серьезных отношений с правительственной советницей, по его словам, у него нет, а свои и ее действия Пилблад назвал "идиотизмом".

Шенстром же, со своей стороны, от комментариев по поводу случившегося отказывалась до самого момента своей отставки. А уходя, извинилась за вечеринку и добавила: она глубоко сожалеет о "беседе с журналистом и о потреблении в это время вина". При этом она не стала уточнять, была ли в тот момент при исполнении служебных обязанностей.

Премьер-министр Швеции Фредрик Рейнфельдт поначалу защищал свою подчиненную. Он заявил, что беседовал с Шенстром по поводу произошедшего и что она сказала ему, что не была пьяна.

Но, добавил он, когда он увидел счет за ту вечеринку, то потерял доверие к ней. *"Я теперь полагаю, что потребление алкоголя, которое доказано фактами, вероятно, перешло через ту границу, которая обеспечивает мою защиту*, — сказал Рейнфельдт на пресс-конференции. — *Это один из самых сложных моментов в политике для меня".*

ВЫБОРЫ В РОССИИ

Беспокойство Вашингтона и Европы

Вашингтон обеспокоен решением Росси сократить число международных наблюдателей на предстоящих выборах в Государственную Думу. *"Мы хотели бы, чтобы выборы в России прошли в свободной и справедливой обстановке, и поэтому мы выражаем беспокойство и разочарование в связи с условиями, которые содержатся в приглашении"*, — заявила пресс-секретарь Белого дома Дана Перино.

Организация по безопасности и сотрудничеству в Европе (ОБСЕ) обвинила Москву в беспрецедентном ограничении деятельности наблюдателей на парламентских выборах. *"Теперь я могу подтвердить, что мы получили приглашение в беспрецедентной форме, поскольку оно накладывает ограничения на масштаб наблюдательской миссии"*, — цитирует Рейтер представителя ОБСЕ.

Ранее председатель Центральной избирательной комиссии Владимир Чуров сообщил, что на парламентские выборы приглашено около 300 наблюдателей, то есть примерно в три раза меньше, чем на прошлые парламентские выборы.

ПАЛІТКУХНЯ

Камунізм ізноў напаўзае на Беларусь

У той час, як у мінулыя выхадныя ў мінскай гасцініцы "Беларусь" сабраліся на з'езд камуністы свету, ва Управе БНФ удзельнікі і госці форуму "У будучыню — без камунізму" казалі аб небяспецы камуністычнага нашэсця.

Алесь МІХАЛЕВІЧ, намеснік старшыні Партыі БНФ:

— Беларусь, як і нашы суседнія краіны, адчула камуністычную ідэалогію на сваёй ўласнай скуры. Па некаторых ацэнках, ад сталінскіх рэпрэсій пацярпелі каля паўтара мільён беларусаў. Але рэпрэсіі — гэта толькі верхняя частка айсберга. Нельга забываць, што на сумленні камуністаў і змова падчас Другой сусветнай вайны з фашыстамі, і афганская вайна, і іншыя злачынствы.

Ігар КУЗНЯЦОЎ, гісторык:

— Сёння адны гісторыкі пішуць гісторыю, а другія яе перапісваюць. І я не прыхільнік выкрасліць 7 лістапада як "чырвоны дзень календара" хаця б таму, што ўся кроў, якая была пралітая затым, — гэта ўсё наступстві кастрычніка 1917 года. Ужо прагучала думка аб тым, што ў светлую будучыню трэба рухацца без камунізму, аднак я не ставіў бы на адну дошку абсалютна ўсіх камуністаў. Паглядзіце — напэўна, больш за палову сённяшніх дэмакратаў — гэта ўчарашнія камуністы. У нас нават дзве камуністычныя партыі. Адны кажуць, што пасля 17-га года было ўсё станоўчае, другія — што было вельмі шмат станоўчага, але знаходзіліся і недахопы. Але я не разумею аднаго — чаму, напрыклад, у газеце "Товарищ" да Дня памяці палітычных рэпрэсій ні радка не знайшлося для таго, каб асудзіць злачынствы сваіх папярэднікаў? Ад камуністаў вельмі цяжка дачакацца пакаяння. І ў гэтым я, як гісторык, бачу сімвал. Расійскі камунізм пачаўся з доміка 1-га з'езда РСДРП. І я ўпэнены, што наш камунізм і завершыцца некалі на тэрыторыі Беларусі.

Уладзімір РУМЛ, Пасол Чэхіі ў Беларусі:

— Антыкамуністычны форум — гэта вельмі важнае мерапрыемства, таму што паралельна праходзіць і з'езд камуністаў свету — падзея мінулага стагоддзя. Калі ў нас адбылася рэвалюцыя, у аднаго вядомага чалавека спыталі: "Што вы думаеце аб камунізме?" Той адказаў: "Камунізм прыдуманы не для чалавека". Гэта абсалютная праўда.

Алесь СВЯТЛАНІЧ.

Из папамобиля на трактор

Итальянский автомобильный концерн Fiat подарил Папе Римскому трактор-тягач, сообщает Earthtimes.org. Белая машина собрана в единственном экземпляре и украшена гербом понтифика.

Тягач предназначен для перевозки 17-тонной платформы, с которой Папа будет давать верующим еженедельную аудиенцию, проводящуюся по средам на площади Святого Петра.

Обычно Папа Римский передвигается по городу на так называемом папамобиле, машине с большой пуленепробиваемой стеклянной кафедрой сзади, оборудованной системой громкоговорителей.

СЕКРЕТЫ ДОЛГОЛЕТИЯ

Как прекрасно проснуться поутру

По данным ООН, жители развитых стран в возрасте 80 лет и старше представляют на планете самую быстро растущую возрастную группу. В чем же секрет долголетия?

Журналист Дэн Бьютнер, передает "Голос Америки", пишет о пожилых, которым стиль жизни помог продлить пребывание на этой земле на 10 и более лет. Его вывод: *"В мире немало мест, где люди живут значительно дольше привычных норм. При этом качество жизни их лучше. Одним из таких оазисом является побережье Коста-Рики".*

Другой благоприятной для долгой жизни точкой оказался остров Пуэрто-Рико. Именно там стоит дом Эмилио Меркадо-дель-Торо, которому в 2006 году исполнилось 114 лет. На его дне рождения правнучка Долорес Мартинес так охарактеризовала подход к жизни своего прадеда: *"Он очень, очень радостный человек. Именно поэтому он живет так хорошо и так долго!"*

Итальянский остров Сардиния — еще одно место, где люди живут хорошо и долго. Антонио Тодде скончался в этом году в возрасте 112 лет; он считал, что дожил до столь преклонного возраста потому, что каждый день выпивал бокал собственного вина.

Все рекордсмены долгожительства независимо от места жительства едят небольшими порциями, употребляют много фруктов и овощей и совсем немного мяса. Исследователи давно обнаружили, что жизнь на высокогорье помогает снизить кровяное давление. Вести активную жизнь необязательно означает заниматься в спортзале. Пожилые жители юга Китая много ходят пешком или ездят на велосипеде. Они также говорят, что им очень помогает поддержка родственников и друзей.

Дэн Бьютнер нашел еще одно место, где пожилые люди до глубокой старости сохраняют активность, Это японский остров Окинава. *"Жителям Окинавы не знакомо слово "пенсионер"*, — рассказывает журналист. — *Они употребляют другое слово, наполняющее энергией их жизнь, — "икигай", что означает: "как прекрасно проснуться поутру".*

Возможно, дело в диете. Более ста лет назад основатель Церкви адвентистов, где немало долгожителей, рекомендовал прихожанам употреблять больше фруктов, овощей, орехов и злаков. Именно это рекомендуют врачи своим пациентам сегодня...

Александр ЯКОВЛЕВ

Сумерки

(Продолжение. Начало в №№137—176.)

Ильичев поморщился, но согласился, решив временно оставить меня в "свободном плавании". Через какое-то время меня перевели в сектор газет, о чем я и просил Ильичева. Печать, особенно ее ошибки, была, как всегда, основной темой разговоров на разных партийных совещаниях, секретариатах. С тех пор как я себя помню в качестве журналиста и партийного работника, газеты, радио, а потом и телевидение постоянно работали в экстремальных условиях. Бесконечная череда снятий с работы, исключений из партии, выговоров, проработок, снижения тиражей в качестве наказания (тиражи определялись не подпиской, а решениями ЦК). Иногда, если "заблудившийся" редактор исправлялся и начинал вести себя дисциплинированно, его подвигали поближе к власти, что изображалось как "доверие".

Особенно противны были жалобы местных партийных руководителей. Как только появлялся острый материал, немедленно в ЦК направлялась цидуля о том, что печать извращает факты, не показывает "огромную" работу парторганизаций, "игнорирует" достижения. И каждый раз приходилось разбираться, проверять, докладывать по сложившимся правилам.

И когда сегодня, спустя полсотни лет, слышу от нынешних функционеров и госчиновников разного рода претензии к печати, я с тоской думаю, что политическая культура, которую насаждали большевики, осталась на том же диком уровне, что и прежде. Как это старо и пошло. Печать душили все лидеры государства, начиная с Ленина.

Пасля глыбокага роздуму і аналізу палітычных падзей Жылуновіч пайшоў за Саветамі, уключыўся ў актыўную прапаганду ідэй новай улады. У кастрычніку 1918 года яго прымаюць у члены РКП (б). З утварэннем беларускіх секцый у партыі камуністаў ён быў абраны старшынёй Маскоўскай секцыі, а хутка і на Усебеларускім з'ездзе камуністычных секцый РКП(б) у Маскве (снежань 1918 г.) — старшынёй ЦБ беларускіх камуністычных секцый. 21—23 снежня ў Маскве была склікана першая канферэнцыя беларускіх камсекцый РКП(б), якая выказалася за ўтварэнне Беларускага савецкага ўрада.

Захаваліся крыніцы, якія даюць падставу сцвярджаць, што асабіста Ленін даручыў Зміцеру Хведаравічу Жылуновічу ўзначаліць першы Беларускі савецкі ўрад. Аднак вядома і тое, што кіраўнікі Паўночна-Заходняй вобласці А.Мяснікоў, В.Кнорын, Р.Пікель, І.Рэйнгольд, М.Калмановіч і іншыя варожа ставіліся да дзейнасці белнацкамаўцаў і беларускіх секцый РКП(б). Аддзяленні Белнацкама ў Віцебску і Смаленску па іх указаннях былі закрыты, выдаваць газету на беларускай мове забаранілі...

Гэтая бальшавіцкая хеўра не прызнавала беларусаў за нацыю, нашу мову лічыла буржуазнай, нацыяналістычнай, інтэлігенцкай выдумкай. 6 кастрычніка 1918 года ў газеце "Звязда" В.Кнорын пісаў: *"Мы лічым, што беларусы не з'яўляюцца нацыяй і што тыя этнаграфічныя асаблівасці, якія аддзяляюць іх ад астатніх рускіх, павінны быць зжытыя. Нашай задачай з'яўляецца не стварэнне новых нацый, а знішчэнне старых нацыянальных рагатак. Беларускі ж рух з'яўляецца такім збудаваннем новых нацыянальных рагатак, якіх не было дасюль, а таму камуністы не могуць у якім бы ні было выглядзе прымаць удзел у гэтым руху".* Таму і ўтварэнне Беларускага савецкага ўрада Кнорын і $К^0$ сустрэлі ў штыкі.

У кнізе *"1 января 1919 года. Временное рабоче-крестьянское советское правительство Белоруссии. Документы и материалы".* (Минск, "Лимариус", 2005 г.) сцвярджаецца (дадатак, дак. №3), што 25 снежня 1918 года ў Маскве на Паварской вуліцы, 52 адбылася нарада Сталіна з адказнымі супрацоўнікамі Белнацкама Жылуновічам, Бібілам, Лагуном, Туруком, Чарнушэвічам і Яхімовічам, на якой Сталін паведаміў, што ЦК РКП (б) прыняў рашэнне абвясціць Беларускую Савецкую Рэспубліку. Быў складзены спіс членаў Часовага рабоча-сялянскага ўрада. Не пазней 29 снежня рукой З.Жылуновіча быў напісаны Маніфест Часовага ўрада на беларускай і рускай мовах.

24 снежня ў Маскву прыехалі А.Мяснікоў з М.Калмановічам. У выніку іх перамоў быццам бы Сталін падпісаў дакумент "Шесть условий тов.Сталина по созданию Белорусской Советской Республики". На жаль, гэтыя ўмовы да сённяшняга дня застаюцца невядомымі. Але вядома іншае: спіс кандыдатаў у члены будучага Часовага ўрада Беларусі, складзены беларусамі на чале з Жылуновічам, быў значна зменены. У ім, супраць волі беларусаў і старшыні ўрада Зміцера Жылуновіча, аказаліся: А.Мяснікоў — камісар па ваенных справах, М.Калмановіч — па забеспячэнні, Р.Пікель — старшыня саўнаргаса... Гэта былі асобы, якія надзвычай варожа ставіліся да ўсяго беларускага — нашай мовы, культуры, гісторыі, нават пярэчылі супраць самой назвы Беларусь! Пры гэтым Мяснікоў, каб утрымаць уладу ў сваіх руках, разам са сваімі хаўруснікамі выпрацаваў хітры сцэнарый і прыняў меры, каб яго ажыццявіць.

Змова

Справа ў тым, што ў час перамоў беларусаў са Сталіным была дамоўленасць: утварэнне Беларускай Савецкай Рэспублікі і яе абвяшчэнне адбудзецца ў Мінску. Мяснікоў жа прапанаваў (і, відавочна, Сталін з ім пагадзіўся): навошта Мінск, калі мы можам гэта зрабіць у Смаленску на 6-й Паўночна-Заходняй партыйнай канферэнцыі РКП(б), якая рыхтуецца?

...Згодна з партыйным распараджэннем з Масквы у Мінск з асаблівай місіяй у ноч на 31 снежня 1918 года выехалі прадстаўнікі Белнацкама і беларускіх секцый РКП(б) на чале з З.Жылуновічам — з запланаваным заездам у Смаленск, на згаданую канферэнцыю. Але... Відаць, гэта была чарговая палітычная авантура Мяснікова, бо канферэнцыя адкрылася... раней, 30 снежня ў 13 гадзін 20 хвілін, калі прадстаўнікі Беларусі яшчэ не выязджалі з Масквы. І пакуль беларусы дабіраліся да Смаленска, Мяснікоў выступіў на канферэнцыі з дакладам "Аб цяперашнім моманце", пасля чаго была прынята рэзалюцыя "Аб абвяшчэнні Заходняй камуны Беларускай Савецкай Рэспублікай".

Атрымалася, што старшыня Часовага рабоча-сялянскага савецкага ўрада Беларусі Зміцер Жылуновіч і члены ўрада — беларусы — на такіх урачыстасцях не прысутнічалі. Больш таго, каб збоку прадстаўнікоў беларускіх секцый РКП(б) не было пярэчанняў, Мяснікоў імкнуўся захаваць за сабой абсалютную ўладу. Ён прапанаваў — і канферэнцыя абвясціла сябе І-м з'ездам Камуністычнай партыі (бальшавікоў) Беларусі". Тут жа было абрана і Цэнтральнае Бюро КП(б)Б на чале з тым жа А.Мясніковым і сакратаром В.Кнорыным. Разлік быў зразумелы. Паколькі бальшавіцкая партыя ў савецкім грамадстве з'яўлялася кіруючай сілай, то і Беларускай Савецкай Рэспублікай будзе кіраваць не старшыня Часовага ўрада З.Жылуновіч, а ён, старшыня ЦБ КП(б)Б А.Мяснікоў...

Пра беспрынцыпнасць гэтага бальшавіцкага начальніка сведчаць і выбары ЦБ КП(б)Б: сярод 15 членаў Бюро аказалася 13 (!) небеларусаў — прыхільнікаў А.Мяснікова: Алібегаў, Калмановіч, Кнорын, Пікель, Пярно, Рэйнгольд і іншыя, якія перад гэтым выступалі супраць утварэння БССР, і толькі два беларусы — Жылуновіч і Лагун.

Набыўшы шляхам непрыстойных махінацый абсалютную большасць у партыйным кіраўніцтве, а праз некалькі дзён і ва ўрадзе, Мяснікоў фактычна ўзяў кіраванне ў свае рукі. Ніякія прапановы ці пярэчанні старшыні ўрада ўжо не прымаліся пад увагу.

Каб паказаць, хто гаспадар у доме, Мяснікоў на скліканай нарадзе ЦБ КП(б)Б перш за ўсё змяніў склад прэзідыума ўрада. Запланаваная раней кандыдатура беларуса П.Клыша на пасаду кіраўніка справамі ўрада была адхілена і прызначаны "свой" — В.Кнорын. Яго старшыня ЦБ абавязаў: урадавую пячаць трымаць у сябе і ўвесь працоўны дзень сядзець у тым жа кабінеце, што і старшыня ўрада З.Жылуновіч. Былі перагледжаны і ўсе іншыя дамоўленасці, звязаныя з фарміраваннем і працай Часовага беларускага ўрада.

Толькі свядомае жаданне сфарміраваць Беларускі ўрад і арганізаваць яго працу на карысць народа, адраджэнне роднага краю прымушала Зміцера Хведаравіча стрымліваць сябе, цярпець уніжэнні і здзекі бальшавіцкіх палітычных авантурыстаў. З.Жылуновіч, З.Чарнушэвіч, Я.Дыла, У.Фальскі, Ф.Шантыр, А.Квачанюк, А.Чарвякоў і І.Пузыроў прасілі ЦК РКП(б) карэнным чынам змяніць становішча спраў або вызваліць іх ад ускладзеных абавязкаў. Аднак ніякага адказу на сваю заяву яны не атрымалі.

Мала таго, бальшавіцкія "вярхі" самі ўчынілі толькі што створанай Беларускай Савецкай Рэспубліцы і яе народу не меншую абразу, чым мяснікоўцы. 16 студзеня 1919 года ЦК РКП(б) без усялякіх кансультацый са старшынёй Беларускага ўрада З.Жылуновічам і, зразумела, без згоды беларускага народа прыняў "мудрае" рашэнне: тры беларускія губерні — Віцебскую, Магілёўскую і Смаленскую далучыць да Расіі. І толькі дзве — Мінскую і Гродзенскую — уключыць у склад Беларускай Савецкай Рэспублікі. Ніякія пярэчанні З.Жылуновіча па гэтым пытанні не мелі поспеху.

Такі чынам, нават самым наіўным і даверлівым стала відавочна, што падпісаная Леніным і Сталіным "Дэкларацыя правоў народаў Расіі" — фікцыя. Пра гэта сведчыла і другое рашэнне ЦК, не менш зневажальнае для Беларусі і Літвы: аб'яднаць іх у Літоўска-Беларускую ССР (Літбел). Для ажыццяўлення гэтых рашэнняў і агульнапалітычнага кіраўніцтва ў Беларусь быў накіраваны А.Іофе. Нягледзячы на ўсе складанасці, З.Жылуновіч і яго паплечнікі, якія ўсім сэрцам зычылі дабра Бацькаўшчыне, шчыра ўзяліся за працу. У студзені 1919 года яны сфарміравалі цэнтральныя рэспубліканскія органы кіравання, правялі выбары ў паветах, а таксама ў Мінскі губернскі з'езд Саветаў і інш.

Зразумела, такія праявы самастойнасці насцярожвалі мяснікоўцаў. Яны бачылі, як прыхільна прымала Жылуновіча і яго паплечнікаў беларускае насельніцтва, як цягнуліся да іх сяляне з пытаннямі, парадамі, просьбамі, як на вачах ажыўлялася нацыянальная свядомасць беларусаў.

Гэта змушала ворагаў Беларусі шукаць спосабу хутчэйшага адхілення членаў урада — беларусаў на чале з Жылуновічам — ад улады. Спрактыкаваныя палітычныя інтрыганы ажыццяўленне сваіх намераў убачылі ў тэрміновым скліканні 1-га з'езда Саветаў Беларусі, які яны, карыстаючыся большасцю і ў ЦБ КП(б)Б і ва ўрадзе, склікалі 2 лютага 1919 года, не даўшы З.Жылуновічу і яго сябрам папрацаваць на карысць свайму народу нават і месяц!

Каб сабраць на з'езд, як кажуць, сваіх людзей, ЦБ КП(б)Б давялося займацца махлярствам. Пры выбарах дэлегатаў ад гарадскіх жыхароў (па перапісе 1897 года ў Мінску жыло 15.108 рускіх, 10.369 палякаў, 46.541 яўрэй, а беларусаў усяго толькі 8164) выбіралі аднаго дэлегата ад 5 тысяч чалавек, а ад вясковага насельніцтва, дзе 85% складалі беларусы, — ажно ад 25 тысяч чалавек. Як відаць, гэта была яўная дыскрымінацыя беларусаў.

Зразумела, з'езд прайшоў пад кіраўніцтвам старшыні ЦБ А.Мяснікова. Нават аб дзейнасці Часовага савецкага ўрада Беларусі (як і па іншых пытаннях), дакладваў не старшыня Зміцер Жылуновіч, а ўсё той жа Аляксандр Мяснікоў і яго аднадумцы Ісаак Рэйнгольд і Рычард Пікель.

3 лютага 1919 года з'езд прыняў першую Канстытуцыю БССР і абраў ЦВК БССР у складзе 50 чалавек. Старшынёй ЦВК быў абраны, канечне ж, Аляксандр Мяснікоў. Членамі ЦВК сталі мала каму вядомыя людзі. Нікому з былых членаў урада — беларусам З.Жылуновічу, Я.Дылу, А.Квачанюку, У.Фальскаму, З.Чарнушэвічу, Ф.Шантыру — пасады ў новым урадзе Беларусі не знайшлося...

Зміцер Хведаравіч, адхілены палітычнымі авантурыстамі ад дзяржаўнага будаўніцтва ў роднай Беларусі, быў вымушаны часова пакінуць Радзіму і пераехаць у Харкаў, дзе нядоўгі час працаваў сакратаром газеты "Красная звезда". У чэрвені таго ж 1919 года быў накіраваны на Паўднёвы фронт, служыў у палітаддзеле штаба 14-й арміі, працаваў у франтавой газеце. Затым ён быў пераведзены ў штаб Заходняга фронту, у Смаленск. Рэдагаваў газету "Савецкая Беларусь" — орган ЦК Кампартыі Літбела і палітаддзела фронту.

Вяртанне на Радзіму

У студзені 1921 года Зміцер Хведаравіч па выкліку ЦК КП(б)Б вярнуўся ў Мінск і актыўна ўключыўся ў дзяржаўнае і культурнае будаўніцтва рэспублікі. З сакавіка ён быў зацверджаны членам калегіі Наркамата нацыянальнасцяў БССР.

Яго пасылаюць у замежную камандзіроўку дзеля арганізацыі друкавання школьных падручнікаў і мастацкай літаратуры на беларускай мове, бо сваёй паліграфічнай базы ў Беларусі тады не было. У Берліне, дзе працавала выдавецтва РСФСР, Жылуновіч прыкладае нямала сіл, каб выдаць як мага больш кніг, дабіцца, каб берлінскія выдавецтвы набылі адметныя беларускія літары "ў" і "ё"... Нягледзячы на цяжкасці і недахоп сродкаў, удалося выдаць "Лемантар" С.Некрашэвіча, "Нашу крыніцу" Я.Лёсіка, "Граматыку" Б.Тарашкевіча, "Алгебру", "Беларускі спеўнік" У.Тэраўскага, шэраг твораў мастацкай літаратуры (у тым ліку ягоны вершаваны зборнік "Песні працы і змагання" і першую частку рамана "Сокі цаліны" — "Бацькава воля"). Адначасова з выдавецкімі справамі Зміцер Хведаравіч вывучаў грамадска-палітычнае жыццё і культуру нямецкага народа, у выніку з'явіўся цыкл вершаў пад агульнай назвай "Берлін".

Розум творцы, вопыт палітыка і інтуіцыя мастака дазволілі яму ўжо ў тыя гады зразумець сутнасць фашызму і выкрыць намеры яго ідэйнага кіраўніка Гітлера, якому, як ён пісаў, *"хочацца рэчак крыві"*. Гісторыя пацвердзіла прадбачанні публіцыста Гартнага наконт тых, каго ён называў *"Каты, каты! Шалёныя дзікія!"*

Зразумела, Зміцер Хведаравіч не мог тады прадчуваць, што нешта падобнае здарыцца пазней і з ім самім на яго ж Радзіме, калі ўласныя "шалёныя, дзікія каты" будуць катаваць яго, як і мноства суграмадзян, у турэмных засценках. Гісторыя пацвердзіла: вялікай розніцы паміж фашысцкімі і сталінскімі вылюдкамі не існавала.

...На той час аўтарытэт З.Жылуновіча як прафесіянала выдавецкай справы стаў неаспрэчным. Дадому ён прывёз шэраг кніг, так патрэбных беларускай школе. Праўда, пазней некаторыя з іх вульгарныя сацыёлагі падверглі рэзкай крытыцы як "нацыянал-дэмакратычныя", а самога арганізатара іх выдання абвінавацілі ў распаўсюджванні нацыянал-дэмакратычнай ідэалогіі. "Практычную граматыку беларускай мовы" (1921 г.) Я.Лёсіка газета "Звязда" наогул назвала контррэвалюцыйнай... Зразумела, такія паклёпніцкія абвінавачванні для спецорганаў служылі "доказам" палітычнай ненадзейнасці і па сутнасці былі палітычным даносам.

Усё ж на пачатку 20-х гадоў, пры недахопе кіруючых кадраў, Зміцеру Хведаравічу — камуністу і быламу рабочаму — яшчэ давяралі адказныя пасады.

У 1922 годзе ён быў накіраваны на працу ў Інбелкульт, затым прызначаецца рэдактарам часопіса "Полымя" і членам калегіі Інстытута гістпарта пры ЦК КП(б)Б, а ў хуткім часе пастаўлены на чале Гістпарта. Са снежня 1922 года Зміцер Хведаравіч — член ЦВК БССР, а з красавіка 1925 года — член ЦВК СССР ад БССР...

Актыўнае стаўленне да жыцця ніколі не пакідала палітычнага і грамадскага дзеяча Зміцера Жылуновіча — паэта і пісьменніка Цішку Гартнага. Для аднаўлення Радзімы, умацавання яе дзяржаўнасці ён не шкадаваў ні сіл, ні таленту. Яму шчыра, усёй душой верылася тады, што светлыя дні роднай зямлі не за гарамі, што працоўны люд сваёй стваральнай працай узніме, аздобіць яе. Зборнік вершаў "Урачыстасць" (1926 г.) прасякнуты аптымізмам творцы, які бадзёра глядзіць у будучыню...

20-я гады ў творчасці Цішкі Гартнага — перыяд актыўнай і плённай літаратурнай дзейнасці. Побач з працай над паэтычнымі творамі ён усё часцей звяртаецца да прозы. У 1924 годзе быў надрукаваны першы зборнік яго апавяданняў "Трэскі на хвалях", у 1927-м — "Прысады" аб жыцці землякоў у складаны, пераломны час. Яшчэ не ведаючы, што многіх з іх гэты час сапраўды пераламае ў літаральным сэнсе — разам з ім самім...

У свой час вялікай папулярнасцю ў чытачоў карыстаўся раман "Сокі цаліны" (1914—1929), у якім паказаны глыбінныя працэсы тагачаснага народнага жыцця, створаны яркія вобразы з рабочага і сялянскага асяроддзя.

Пісьменнік паспрабаваў свае творчыя сілы і ў драматургіі. У свой час на сцэне БДТ з поспехам ішла яго драма "Сацыялістка". Драма "Хвалі жыцця", п'есы "На стыку" і "Дзве сілы" ставіліся ў гуртках мастацкай самадзейнасці.

У перыядычным друку Гартны выступаў з працамі манаграфічнага характару, з літаратурнымі аглядамі і крытыка-біяграфічнымі нарысамі — "Янка Купала", "Пушкін і Вяземскі" і іншымі. Вывучаў творчасць Адама Міцкевіча, яго сувязь з рускай і беларускай літаратурамі. Артыкулы крытычнага характару, на палітычныя і гістарычныя тэмы змяшчаліся ў часопісах "Полымя", "Маладняк", газетах. Ён не быў прыстасаванцам, не пісаў па заказе, а выкладаў уласнае бачанне падзей і з'яў, жывым удзельнікам якіх быў сам. Ён заўжды заставаўся самім сабою, у многіх выпадках пададзены ім матэрыял разыходзіўся з афіцыйнымі бальшавіцкімі догмамі.

Ён і яго паплечнікі, сапраўдныя патрыёты Беларусі, самаахвярна, з натхненнем працавалі дзеля адраджэння Бацькаўшчыны. Варта нагадаць сучаснікам — з удзячнасцю і пашанай — нацыянальных лідэраў таго часу: старшыню ЦВК БССР **Аляксандра ЧАРВЯКОВА,** старшыню СНК БССР **Язэпа АДАМОВІЧА,** міністра асветы **Усевалада ІГНАТОЎСКАГА,** міністра земляробства **Зміцера ПРЫШЧЭПАВА** і іншых. І, канечне ж, старшыню першага савецкага ўрада БССР, выдатнага дзяржаўнага дзеяча **Зміцера ЖЫЛУНОВІЧА.**

Беларусізацыя

У ліпені 1924 года другая сесія ЦВК БССР афіцыйна прыняла дзяржаўную палітыку беларусізацыі. Наркамасветы даручыла ўвесці беларускую мову ва ўсіх школах і вышэйшых навучальных установах, а пры прыёме ў тэхнікумы і ВНУ — экзамены па беларускай мове. Першымі перавялі справаводства на беларускую мову ЦВК і Саўнаркам, Наркамасветы, Наркамзем — установы, якія былі непасрэдна звязаны з насельніцтвам. З канца 1925 года пасяджэнні і пратаколы Бюро ЦК і акружкамаў КП(б)Б таксама вяліся па-беларуску.

У 1927 годзе нацыянальнай мовай валодалі ўжо 80% служачых цэнтральных дзяржаўных устаноў. К 1928 году 80% школ працавала на беларускай мове. Пры гэтым ва ўсіх навучальных установах беларуская і руская мовы сталі абавязковымі прадметамі. Дарэчы, выкладанне ў некаторых школах вялося на нацыянальных мовах — адпаведна са складам тагачаснага насельніцтва.

Узрасло імкненне моладзі да ведаў. З народных нізоў у літаратуру прыйшлі маладыя, свежыя сілы, таленавітыя творцы: **Андрэй АЛЕКСАНДРОВІЧ, Пятрусь БРОЎКА, Пятро ГЛЕБКА, Алесь ЗВОНАК, Уладзімір ЖЫЛКА, Кандрат КРАПІВА, Васіль СТАШЭЎСКІ, Паўлюк ТРУС, Кузьма ЧОРНЫ, Станіслаў ШУШКЕВІЧ** і шмат іншых.

З.Жылуновіч — Цішка Гартны, рэдагуючы газету "Савецкая Беларусь", часопіс "Полымя" і загадваючы Белдзяржвыдавецтвам, як ніхто іншы дбайна клапаціўся пра выхаванне літаратурнай моладзі, дапамагаў ёй развіваць свае здольнасці. Пра гэта з удзячнасцю потым пісалі ў сваіх успамінах **Сяргей ГРАХОЎСКІ, Уладзімір ДУБОЎКА, Максім ЛУЖАНІН, Ян СКРЫГАН, Мікола ХВЕДАРОВІЧ, Станіслаў ШУШКЕВІЧ...**

На новым узлёце была творчасць пісьменнікаў старэйшага пакалення — Янкі Купалы, Якуба Коласа, Змітрака Бядулі, Максіма Гарэцкага, самога Цішкі Гартнага. Такім чынам беларусізацыя ў 1924—1928 гадах стала стрыжнем грамадска-палітычнага жыцця, садзейнічала абуджэнню нацыянальнай свядомасці і годнасці беларусаў, развіццю іх мовы і літаратуры, мастацтва, навукі і тэхнікі. Але тое доўжылася ўсяго некалькі гадоў...

Сёння не ўсе ведаюць, што ў сувязі з 15-годдзем творчай дзейнасці Ц.Гартнага Наркамасветы БССР яшчэ ў 1923 годзе прадставіў яго, а пленум ЦК КП(б)Б пастанавіў: "прысвоіць тав.Жылуновічу званне народнага паэта Беларусі". Аднак адпаведнай урадавай пастановы так і не з'явілася. Відавочна, для гэтага былі пэўныя прычыны, але якія?

У той час ужо ішлі праверкі і чысткі партыйных ячэек апаратаў, устаноў. Праверачная камісія партячэйкі Наркамасветы БССР у чэрвені 1924 года выключыла Жылуновіча з партыі на 1 год *"за адарванасць ад мас і абывацельскую псіхалогію".* Ён абвінавачваўся ў тым, што ўдзельнічаў... у пахаванні з царкоўным рытуалам свайго швагра, а яшчэ... прыстойна апранаўся (звычайна хадзіў у касцюме, капелюшы, з гальштукам і палачкай у руцэ), што лічылася ўгодніцтвам перад Захадам. Для дагматыкаў з партыйнымі білетамі было дастаткова таго, што Жылуновіч на пахаванні швагра пастаяў каля царквы — і ўжо за гэта яго можна было прыцягваць да партыйнай адказнасці. Якое беспадобнае ганьбаванне найвыдатнейшага чалавека! Праўда, тады, пасля апеляцыі ў ЦКК РКП(б)Б, ён быў адноўлены ў партыі, але ўсё ж з суровай вымовай з папярэджаннем.

Гартнага вінавацілі ў многіх грахах — і ў абсалютнай большасці несправядліва. Тэндэнцыйным і абсурдным было сцвярджэнне, быццам ён, Гартны, *"увесь час арыентуецца на буржуазны Захад у процівагу Саюзу ССР, хваліў буржуазную культуру..."* Уся літаратурная спадчына Гартнага, у тым ліку і публіцыстычная дзейнасць, абвяргаюць такое абвінавачванне. Але што некаторым "даследчыкам" да рэальных фактаў?

Ужо ў 1954 годзе прафесар Н.Каменская пісала: *"Як высветлілася пазней, Жылуновіч, Лагун і іншыя нацыяналісты былі агентамі замежных імперыялістаў і, выконваючы іх заданні, намагаліся парушыць адзінства партыйных радоў і сарваць ажыццяўленне мерапрыемстваў Камуністычнай партыі".* Заканамерна было б спытаць у гэтай "вучонай" дамы, на чым грунтуецца яе "навуковае адкрыццё"?

...Семдзесят гадоў мінула са дня смерці Ц.Гартнага, але толькі цяпер ён пачынае ўсведамляцца намі ва ўсёй глыбіні, багацці і разнастайнасці таленту, з усімі ўзлётамі, прызямленнямі, памылкамі і сумненнямі. Мы яшчэ і сёння вельмі мала ведаем Гартнага-публіцыста. Некалькі соцень (!) яго артыкулаў, нарысаў, фельетонаў, аглядаў, рэцэнзій і г.д. уяўляюць сабою страсны публіцыстычны і філасофскі дослед-рэпартаж пра той час. У іх знойдзеш багаты матэрыял для вывучэння гісторыі краіны ў 20-я і першай палове 30-х гадоў. Яны яшчэ чакаюць свайго даследчыка. І мастацкія, і публіцыстычныя творы Ц.Гартнага — жывое сведчанне тагачаснай эпохі.

На жаль, у той час нават асобныя няўдалыя фармуліроўкі ў працах літаратараў ці гісторыкаў вульгарызатары і дагматыкі выкарыстоўвалі як зручны момант, каб узвесці паклёп, учыніць данос на таго ці іншага добрасумленнага працаўніка і атрымаць за тое пахвалу ці павышэнне па службе.

(Заканчэнне на 8-й стар.)

(Заканчэнне. Пачатак на 7-й стар.)

Нешта падобнае здарылася з Ц.Гартным падчас так званай "тэатральнай дыскусіі", якая пачалася ў 1928 годзе з апублікавання артыкула Т.Глыбоцкага "Даволі анекдотаў". У тым артыкуле выказвалася незадаволенасць рэпертуарам Беларускага дзяржаўнага тэатра, якому яўна не ставала нацыянальнага рэпертуару — спектакляў па творах Купалы, Коласа і іншых выдатных творцаў. Аўтара непакоіла і тое, што артысты беларускага тэатра "без усялякага жалю калечаць нашу мову".

Выкарыстоўваючы палітычную сітуацыю ў краіне, выкліканую прамовай Сталіна "Аб барацьбе з ухіламі і прымірэнцтвам да іх" дагматыкі і фальсіфікатары сказілі змест артыкула Глыбоцкага, абвінавацілі яго ў правым ухіле і нацыяналізме. Распраўляліся вульгарныя сацыёлагі з літаратурнымі апанентамі як з палітычнымі ворагамі.

Ц.Гартны смела і мужна глядзеў праўдзе ў вочы, нягледзячы на небяспеку трапіць у "хаўруснікі" Т.Глыбоцкага. Ён выступіў з выдатным артыкулам "Беларуская самабытнасць і безухільны інтэрнацыяналізм, ці старая пагудка на новы лад", у якім з эмацыянальнай узрушанасцю і палемічным запалам даў належны адпор паклёпнікам. Аднак партыйныя органы палічылі, што Гартны дапусціў палітычную памылку. На яго было накладзена партыйнае спагнанне за прымірэнцтва. Фактычна за тое, што сумленне не дазволіла не выступіць на баку праўды. Але ўдумлівы, разважлівы і прынцыповы чалавек заўсёды кіраваўся праўдай жыцця!

Замоўчваць такія гістарычныя факты мы не маем права. Сучасны чытач павінен ведаць, на якіх пазіцыях стаялі нашы літаратурныя аўтарытэты ў гады сталіншчыны, у гады парушэння дэмакратыі і законнасці.

Годнасць Зміцера Жылуновіча як кіраўніка, а ён займаў адказныя дзяржаўныя пасады, заключалася ў тым, што ён меў асабістыя погляды на падзеі грамадска-палітычнага жыцця, а гэта супярэчыла бальшавіцкім установкам. Партыйныя босы прывучалі ўсіх думаць так, як загадваў "бацька народаў". Кадры трэба было трымаць у цуглях, у напружанні і страху.

...Не паспелі яшчэ падрыставацца да юбілейных урачыстасцяў у сувязі з 20-годдзем літаратурнай дзейнасці пісьменніка, як 17 снежня 1928 года Парткалегія ЦКК КП(б)Б абʼявіла яму чарговую вымову "за спробу праследавання крытыкі недахопаў у Цэнтрархіве", якім Жылуновіч загадваў па сумяшчальніцтве. Спагнанне было выклікана чарговым даносам паклёпнікаў. Звярніце ўвагу: вымова не за *праследаванне* "крытыкі недахопаў", а толькі *"за спробу"*... Уражвае бальшавіцкая пільнасць!

З часу вышэй згаданай тэатральнай дыскусіі за кожным крокам Зміцера Жылуновіча сачылі: дзе што сказаў, як і дзе напісаў. Але і тады ён заставаўся самім сабою, усімі сіламі садзейнічаў беларускасці ў той жа час, калі для партакратаў гэта было косткай у горле.

Пагром

І ўсё ж вынікі першага этапу беларусізацыі былі відавочна паспяховымі. Яны садзейнічалі развіццю беларускай мовы, літаратуры, культуры і духоўнасці беларускага народа. Гэта не на жарт узрушыла бальшавікоў-"інтэрнацыяналістаў". Пачаўся пагром дасягнутага вялікай працай прыхільнікаў беларушчыны. Артадоксы ўбачылі, што на фоне сталінскага "крутого поворота" і "великого перелома во всей политике" ў партыйнай арганізацыі Беларусі не ўсё ў парадку. І таму ўжо ў траўні 1929 года ў Беларусі працавала спецыяльная камісія ЦКК ВКП(б) на чале з В.Затонскім, які ўсё ў той жа нашумелай "тэатральнай дыскусіі" ўбачыў *"твар беларускага шавінізму"*, адкрытае "выступленне нацыяналістаў". Мелася на ўвазе пісьмо трох маладых паэтаў — студэнтаў Белдзяржуніверсітэта А.Александровіча, А.Дудара, М.Зарэцкага ў газеце "Савецкая Беларусь", якую Затонскі назваў *"утульным прыстанкам беларускіх шавіністаў"*, дзе друкуюцца "контррэвалюцыйныя пісьмы". Абвінавачанне недарэчнае.

Негатыўна выказаўся Затонскі і адносна артыкула З.Жылуновіча "20 гадоў назад (успаміны з мінулага)" ("Полымя", №5, 1929 г.). Бюро ЦК КП(б)Б на чале з Я.Гамарнікам асудзіла артыкул Жылуновіча, пазбавіла яго пасады намесніка міністра асветы і кіраўніка Галоўмастацтва, вызваліла ад працы ў рэдакцыі "Полымя".

Восенню 1929 года ў партыйнай ячэйцы Наркамасветы, дзе працавала камісія па праверцы і чыстцы членаў і кандыдатаў КП(б)Б, 10—13 лістапада праходзіў "чысцілішча" і член КП(б)Б З.Жылуновіч. Азнаямленне з пратаколам так званай праверачнай камісіі дае права сцвярджаць, што праверка праводзілася на вышыні бальшавіцкага абсурду, пры адсутнасці элементарнай этыкі, культуры, павагі да чалавека-інтэлігента, буйнога грамадскага і дзяржаўнага дзеяча, таленавітага пісьменніка, якім зʼяўляўся Зміцер Хведаравіч. Калі сябры па працы і, у прыватнасці, Ян Марук паспрабавалі абараніць З.Жылуновіча ад незаслужанай крытыкі, адзначыць яго заслугі перад беларускім народам, член праверкама Якаўлеў без ценю сумлення заявіў: "Эвалюцыя Марука — эвалюцыя класавага ворага". Сталінская дактрына абвастрэння класавай барацьбы спрацоўвала спаўна.

Праверачная камісія пастанавіла:

"За сістэматычнае выказванне поглядаў, аб'ектыўна накіраваных супраць партыі і сацыялістычнага будаўніцтва, бюракратызм і адарванасць ад партыйнага жыцця выключыць Жылуновіча з шэрагу КП(б)Б".

Таго, хто самааддана служыў свайму народу, абвінавачвалі ў цяжкіх злачынствах. Стварыўшы пагрозу яго жыццю, Зміцера Хведаравіча змушалі каяцца, апраўдвацца ў памылках, якіх не было. 22 лістапада 1929 года ён мусіў напісаць заяву ў Мінскую акружную кантрольную камісію, у якой пад ціскам абставін прызнаваў шэраг сваіх "буйных і шкодных памылак".

Тым часам газета "Звязда" ў артыкуле "Выкрыем манеўры нацыянал-дэмакратычных банкрутаў" выказала сумненне ў шчырасці "пакаяння" і "абяцаннях вернасці Савецкай уладзе". У тым жа нумары газета абʼявіла нацыянал-дэмакратызм ідэалогіяй капіталістычных элементаў, якія з пазіцый буржуазнага нацыяналізму вядуць рашучую барацьбу супраць сацыялістычнага будаўніцтва.

Зразумела, што камісія, якую ўзначальваў Затонскі, даволі негатыўна ацаніла палітыку нацыянальна-культурнага адраджэння ў БССР. Гэта была інквізітарская праверка...

Між тым Мінская акруговая камісія, улічыўшы пакаянную заяву З.Жылуновіча, 14 студзеня 1930 г. пастанавіла: "...У партыі аставіць, абвясціўшы яму за ідэалагічныя хістанні суровую вымову з папярэджаннем". А таксама *"Абавязаць т.Жылуновіча весці актыўную барацьбу з усякімі ўхіламі ад генеральнай лініі партыі, асабліва з беларускім нацыянал-дэмакратызмам"* і нават "прымацаваць яго да адной з вытворчых ячэек".

Апальны камуніст быў вымушаны пайсці на Мінскі станкабудаўнічы завод "Камунар" (цяпер завод імя Кірава) і каля двух гадоў там "ідэйна перавыхоўваўся". Але, нягледзячы на прыніжэнне асобы акадэміка, пісьменніка, палітычнага дзеяча ён не апусціў рукі і не згубіўся ў рабочым калектыве. Зблізіўся з людзьмі, напісаў нямала нарысаў, вершаў, апавяданняў, героямі якіх былі тыя, каго ён добра зведаў. Гэтыя творы разам з апавяданнем "Пахучы зяб" і аповесцю "Зялёны шум" былі выдадзены асобным зборнікам "Наступ на горны" (1932 г.).

Злавесную, трагічную ролю ў лёсе беларускай інтэлігенцыі адыграў пленум ЦК КП(б)Б, які адбыўся 20—25 кастрычніка 1930 года. Пра палітычную сітуацыю ў рэспубліцы таго часу і пра ход самога пленума расказаў доктар гістарычных навук Расціслаў Платонаў ("Рэспубліка" ад 5 кастрычніка 1994 г.). З дакладам "Аб чарговых задачах у нацпалітыцы" выступіў першы сакратар ЦК КП(б)Б К.Гей. Найбольш інтрыгуючай была закрытая частка пленума, калі Гей абвясціў, што сведчанні на допыце арыштаванага Язэпа Лёсіка далі магчымасць "вытявіць" у Беларусі контррэвалюцыйную арганізацыю нацдэмаў — "СВБ" ("Саюз вызвалення Беларусі"). І што менавіта Лёсік назваў імёны Жылуновіча, Баліцкага, Ільючонка, Прышчэпава і іншых як апору для нацдэмаў, з дапамогай якіх у партыю пранікалі контррэвалюцыйныя элементы. Аўтар артыкула Р.Платонаў не сумняваецца ў тым, што прыпісаныя Лёсіку сведчанні былі не чым іншым, як фальсіфікацыяй следчых, якія самі пісалі пратаколы допыту, а затым прымушалі падследнага падпісваць іх.

Другі высокі партыйны выступоўца Г.Рапапорт пераконваў, што дзейнасць "Саюза вызвалення Беларусі" актывізавалася пасля вяртання з эміграцыі ў 1925—1926 гадах значнай часткі нацыянал-дэмакратаў і былых міністраў БНР. Фальсіфікатар без цені сораму даводзіў, што згуртаванню гэтай "контррэвалюцыйнай арганізацыі" садзейнічала... акадэмічная канферэнцыя па беларускім правапісе і азбуцы ў лістападзе 1926 года і што пад выглядам навуковай была склікана і праведзена канферэнцыя нацыянал-дэмакратаў і нацыянал-фашыстаў...

Гэта была дзікунская, атрутная хлусня, бо ніякага "СВБ" ў Беларусі і ў паміне не было, проста не існавала. Гэта ўжо дакладна ўстаноўлена Вярхоўным судом і Генеральнай пракуратурай Рэспублікі Беларусь. Але за той правакацыяй — дзесяткі і сотні знявечаных, замучаных, загінуўшых нашых з вамі суайчыннікаў. Зразумела, асуджаныя і расстраляныя па гэтай справе пасмертна рэабілітаваныя. Ды не ўваскрэшаныя...

Вядома, што камісія Затонскага дзейнасць па нацыянальна-культурным адраджэнні БССР ацаніла даволі крытычна, пры гэтым асаблівую ўвагу звярнула на небяспеку нацыянал-дэмакратызму ў Беларусі. Спачатку сталіністы-бальшавікі трактавалі яго як правы ўхіл у культурным будаўніцтве, калі нацыянальныя інтарэсы ставіліся вышэй класавых. Затым палітычныя ацэнкі нацыянал-дэмакратызму штучна абвастраліся і трактаваліся ўжо як нацыянал-фашызм, контррэвалюцыйная зʼява, накіраваная на рэстаўрацыю капіталізму ў БССР.

Вядома таксама, што яшчэ пры фарміраванні дзяржаўнасці Беларусі група А.Мяснікова (Мяснікʼяна) лічыла дзейнасць Белнацкама, беларускіх камуністычных секцый РКП(б) і беларускага нацыянальна-вызваленчага руху нацыяналістычнай і ў іх разуменні — рэакцыйнай. **А між тым словы "нацыяналізм", "нацыяналістычны" азначаюць не што іншае, як рух за нацыянальную незалежнасць, змаганне за інтарэсы свайго народа, за развіццё роднай мовы і культуры, за духоўнасць сваёй нацыі. Карацей кажучы, нацыя без нацыяналізму, па сутнасці, не можа паўнакроўна існаваць!**

Дарэчы сказаць, цудоўны рускі пісьменнік Канстанцін Паустоўскі аднойчы сказаў: *"По отношению каждого человека к своему языку можно совершенно точно судить не только о его культурном уровне, но и о его гражданской ценности. Истинная любовь к своей стране немыслима без любви к своему языку. Человек, равнодушный к родному языку, — дикарь. Он вредоносен по самой своей сути потому, что его безразличие к языку объясняется полнейшим безразличием к прошлому, настоящему и будущему своего народа"*. Савецкім бальшавікам-інтэрнацыяналістам гэтага не дадзена зразумець.

У сувязі з "СВБ" у нацыянал-дэмакратызме абвінавачвалі не толькі З.Жылуновіча, а і У.Ігнатоўскага, С.Некрашэвіча, Я.Лёсіка і іншых. Спрабавалі далучыць да гэтай справы і Янку Купалу. Над З.Жылуновічам спецорганы ўстанавілі знадворнае назіранне. Прозвішча яго з кляймом нацдэма не сыходзіла са старонак прэсы. Вульгарызатары-сацыёлагі абвінавачвалі яго ў ідэалізацыі нашаніўскіх пісьменнікаў, у затушоўванні класавай барацьбы на літаратурным фронце. Патрабавалі адмовіцца ад сваіх поглядаў.

Пры гэтым трэба аддаць належнае і Гартнаму: дыфірамбаў Сталіну ён не спяваў, хвалебных одаў яму не пісаў.

Літаратурнае аб'яднанне "Полымя" (у першым радзе сядзяць злева направа Якуб Колас, Цішка Гартны, Янка Купала).

Зміцер Хведаравіч Жылуновіч з жонкай Надзеяй Сіпяпанаўнай, дачкой Галінай (злева) і сынам Алегам.

«Перамога бальшавіцкай непрымірымасці»

Пад цяжарам невыносных душэўных пакут і пякучага сардэчнага болю Зміцер Хведаравіч 13 снежня 1929 года напісаў пісьмо ў ЦК і ЦКК КП(б)Б "Мае памылкі і іх карэнні", дзе перакрэсліў усю сваю папярэднюю шчырую патрыятычную дзейнасць на карысць Радзіме. Ён ратаваў гэтым крокам жыццё сваіх родных і блізкіх. Сталінская рэпрэсіўная машына ламала людзей, прымушала іх прызнаваць віну нават тады, калі яны ні ў чым не былі вінаватыя, апраўдвацца ў тым, у чым іх незаконна абвінавачвалі.

Сучаснаму чытачу і асабліва маладому пакаленню цяжка зразумець, што прымушала добрасумленных савецкіх людзей (партыйных і беспартыйных, чыноўнікаў і шэрагоўцаў) раздвойвацца, перамагаць саміх сябе, прызнаючыся ў "контррэвалюцыйнай дзейнасці, шпіянажы" і іншых злачынствах, якіх не здзяйснялі. Нярэдка агаворвалі не толькі саміх сябе, а нават родных і знаёмых. Бо ведалі — у процілеглым выпадку іх арыштуюць і фізічнымі катаваннямі прымусяць падпісаць пратакол, патрэбны сталінскім дэспатам.

20 снежня 1929 года "Звязда" пад загалоўкам "Перамога бальшавіцкай непрымірымасці" так каменціравала падзеі: "З.Жылуновіч быў адным з галоўных ідэолагаў нацыянал-дэмакратычнага ўхілу ў КП(б)Б..., абʼектыўна стаў рупарам нацыянал-дэмакратычных элементаў краіны... Заява З.Жылуновіча — гэта яшчэ адно банкрутства нацыянал-дэмакратычных элементаў у нашай партыі..."

Пасля кастрычніцкага пленума пачаўся разгляд "спраў" членаў партыі, якія абвінавачваліся ў нацыянал-апартунізме і нацыянал-дэмакратызме. Першымі ішлі справы З.Жылуновіча і У.Ігнатоўскага.

16 студзеня 1931 года Прэзідыум і Парткалегія ЦКК КП(б)Б пастанавілі:

"Жилунович Д.Ф. за сознательное проведение национал-оппортунистической и национал-демократической линии, за участие в антипартийных группировках КП(б)Б, за связь с чуждыми и враждебными делу пролетариата нацдемовскими и фашистскими элементами, и как являющегося рупором враждебных сил, которого использовала в своих целях нацдемовская контрреволюция в борьбе с диктатурой пролетариата, — из рядов КП(б)Б — исключить".

Безумоўна, усё пералічанае, за што быў выключаны з партыі З.Жылуновіч, — заўзятая хлусня, ні ў адным слове няма і долі праўды. Падпісалі пастанову партыйныя чыноўнікі А.Калнін і А.Рыскін. Першы з іх яшчэ ў 1919 годзе, калі быў губернскім дзеячам у Віцебску, разам з групай А.Мяснікова выступаў супраць утварэння Беларускай Савецкай Рэспублікі і супраць членаў яе ўрада на чале з З.Жылуновічам. Другі — сцвярджаў, што Жылуновіч "с 1907 по 1916 год (с перерывом) примыкал к меньшевистской организации..." і іншую лухту. Ну, а калі З.Жылуновіч меншавік, то само сабой зразумела, ён — "вораг народа", якога можна і расстраляць.

Трэба, каб наша моладзь ведала: сталінская рэпрэсіўная машына была самай бесчалавечнай, лютай, маньяцкай. Мала таго, што арыштоўвалі, катавалі і расстрэльвалі ні ў чым не вінаватых, дык яшчэ быў дадзены дазвол на расстрэл дзяцей "ворагаў народа" з 12-гадовага ўзросту.

...Першага прэзідэнта Акадэміі навук БССР У.Ігнатоўскага 16 студзеня 1931 года разам з З.Жылуновічам па сфальсіфікаваных матывах выключылі з партыі. Лютае цкаванне стала прычынай таго, што У.Ігнатоўскі скончыў жыццё самагубствам. Аднак сталінскім сатрапам падалося, што смерць Усевалада Макаравіча — недастатковая мера яго пакарання. У нябожчыка ж засталіся сыны. У 1936 годзе яго сыноў — 20-гадовага Валянціна і 25-гадовага Юру Ігнатоўскіх арыштавалі, і ў 1937-м расстралялі. Была арыштавана і жонка У.Ігнатоўскага — Марыя Севасцьянаўна. Пасля турэмнага зняволення яе асудзілі да васьмігадовай высылкі ў лагер.

Так сталінскія вар'яты здзекаваліся са свайго народа, з лепшых яго сыноў. А мы "роднаму" Сталіну пелі дыфірамбы. Ды і цяпер некаторыя пяюць.

Ордэр №739

Адзін дакумент хачу прывесці цалкам (даецца без правак):

Справа №9031 па абвінавачванні З.Х.Жылуновіча:

"Постановление 1936 года 15 ноября г.Минск.

Я, начальник 3-го отделения ОО УГБ НКВД БССР лейтенант государственной безопасности Шлифенсон, рассмотрев следственное дело за №9031, нашел: Что литературный работник Белорусской Академии наук Жилунович, является активным участником контрреволюционной фашистской организации, вскрытой в г.Минске, а посему постанавляю: Жилуновича Д.Ф. (Тишка Гартный) литературного сотрудника Белорусской Академии наук, проживающего в г.Минске, по Московской улице дом №8/1 — арестовать и в квартире произвести обыск".

Начальник 3-го отделения ОО лейтенант Государственной безопасности Шлифенсон.

Согласен начальник ОО УГБ НКВД БССР Карелин.

Ордер на арест №739.

Гэта — пачатак трагічнага фіналу слыннага сына Бацькаўшчыны, знішчанага сталінскай сістэмай.

...Следства па справе З.Жылуновіча, якое пачалося 16 лістапада 1936 года, вёў капітан Зіновій Маркавіч Ушакоў, які вызначаўся асаблівай жорсткасцю і бязлітаснасцю. Фізічныя і маральныя катаванні знясіленага Зміцера Хведаравіча давялі ажно да страты розуму. Пасля чаго следчы прымусіў ахвяру напісаць заяву пра сваю нібыта контррэвалюцыйную дзейнасць, назваць вядомых яму ўдзельнікаў "контррэвалюцыйных" арганізацый. Але нават па стылі і граматычных памылках у заяве можна меркаваць, што яна складалася не пісьменнікам і вучоным Ц.Гартным, а пад дыктоўку следчага. Усе астатнія пратаколы следства напісаны рукой Ушакова ці яго даверанай асобай. Менавіта за ўмельства ў фальсіфікацыі падобных працэсаў следчага забралі на павышэнне ў Маскву на пасаду начальніка Асобага аддзела НКВД СССР. А ўжо там самога выкрылі як "шпіёна нямецкай разведкі і ўдзельніка антысавецкай арганізацыі" і расстралялі.

А тым часам хворага і звар'яцелага Зміцера Жылуновіча ўсё часцей выклікалі на допыты. Ён, амаль у непрытомнасці, называў прозвішчы і імёны людзей, якіх помніў, з якімі сустракаўся. А ўжо следчыя "залічвалі" названых у тую ці іншую "контррэвалюцыйную, шпіёнскую" арганізацыю. Праз некалькі дзён гэтыя занесеныя ў пратакол прозвішчы аўтаматычна рабілі іх носьбітаў падследнымі. Так круцілася шалёная машына смерці...

Для нкусаўцаў Зміцер Хведаравіч быў знаходкай. З яго "дапамогай" яны з поспехам выконвалі план выкрыцця і лоўлі "ворагаў народа".

А сам Зміцер Хведаравіч ужо не мог хадзіць, дыхаць. Яно ж усё цягалі па следчых кабінетах і толькі ў студзені 1937 года перавялі ў турэмную бальніцу НКВД. Аднак стан здароўя знявечанага катаваннямі чалавека пагаршаўся. 7 красавіка 1937 года ледзь жывога Зміцера Жылуновіча з Мінскай турэмнай бальніцы перавезлі ў Магілёўскую псіхбальніцу. 11 красавіка ён памёр, не дажыўшы да 50 гадоў...

***

Лёс выбітнага сына беларускага народа Зміцера Хведаравіча Жылуновіча, як мы пераканаліся, быў надзвычай цяжкім і пакутлівым. Усё сваё жыццё ён мужна змагаўся за адраджэнне беларускага народа, хацеў, каб ён са сваёй багатай тысячагадовай гісторыяй быў раўнапраўным з іншымі народамі свету, каб дзеці нашых людзей вучыліся і размаўлялі на роднай мове, каб багацела родная літаратура, каб развівалася наша мастацтва, раслі культура і духоўнасць. Са сваімі сябрамі і паплечнікамі ён стаяў ля вытокаў беларускай дзяржаўнасці, мужна змагаўся з тымі, хто варожа ставіўся да ўсяго беларускага.

Менавіта за гэта ворагі Беларусі называлі яго нацыяналістам і сепаратыстам. А быў ён адданым патрыётам сваёй Айчыны.

На жаль, мы, беларусы, мала зрабілі для таго, каб прыстойна ўшанаваць і ўвекавечыць памяць найвыдатнай асобы ў сваёй гісторыі, знанага дзяржаўнага і грамадскага дзеяча, вядомага пісьменніка Зміцера Хведаравіча Жылуновіча — Цішку Гартнага. Ён заслугоўвае таго, каб у сталіцы Беларусі і ў яго родным Капылі былі ўстаноўлены годныя помнікі, а плошча імя сумнавядомага Мяснікова ў Мінску была перайменавана ў гонар Жылуновіча...

Аляксей КЛАЧКО,
заслужаны настаўнік БССР,
кандыдат філалагічных навук,
дацэнт, ветэран вайны і працы.

P.S. Ганарар за артыкул — на карысць "Народнай волі".

КОРАТКА ПРА АЎТАРА

Аляксей Мартынавіч Клачко *— зямляк Зміцера Жылуновіча: родам з Капыльшчыны, з сям'і рэпрэсаваных сялян. Пасля сканчэння Мінскага дзяржаўнага педінстытута імя А.М.Горкага (цяпер Беларускі дзяржаўны педагагічны універсітэт імя М.Танка) абараніў кандыдацкую дысертацыю па творчасці Цішкі Гартнага (Зміцера Жылуновіча). Амаль паўстагоддзя выкладаў мову і літаратуру ў розных навучальных установах. Кандыдат філалагічных навук, дацэнт, заслужаны настаўнік Беларусі, ветэран вайны і працы.*

ГАЗЕТА — ЧЫТАЧЫ

І ў 2008-м будзем разам!

Не спазніцеся, калі ласка, з перадаплатай за нумары першай паловы наступнага года

0402280179
ИЗВЕЩЕНИЕ

ИЧУП «Народная воля»
получатель платежа
«Приорбанк» ОАО ЦБУ 113 г.Минск
наименование банка
Счет получателя 3012006535014 Лицевой счет код 749
УНН* 100961759
(фамилия, имя, отчество, адрес)

Вид платежа			Дата	Сумма
Предоплата за ноябрь, декабрь 2007 г., январь, февраль, март, апрель, май, июнь 2008 г. (ненужное зачеркнуть)				
Плательщик			Пеня	
			Всего	

Кассир

ИЧУП «Народная воля»
получатель платежа
«Приорбанк» ОАО ЦБУ 113 г.Минск
наименование банка
Счет получателя 3012006535014 Лицевой счет код 749
УНН* 100961759
(фамилия, имя, отчество, адрес)

Вид платежа			Дата	Сумма
Предоплата за ноябрь, декабрь 2007 г., январь, февраль, март, апрель, май, июнь 2008 г. (ненужное зачеркнуть)				
Плательщик			Пеня	
			Всего	

КВИТАНЦИЯ
Кассир М.П.

* Заполняется только при осуществлении операции по уплате налогов

Абонентская карточка
на номера газеты «Народная воля»
за ноябрь, декабрь 2007 г., за январь, февраль, март, апрель, май, июнь 2008 г.
(ненужное зачеркнуть)

Заполняется отчетливо ***печатными буквами и обязательно*** *отправляется в редакцию с* ***копией платежного документа***

фамилия
имя отч.
индекс почтового отделения
область
район
название населенного пункта
город, городской поселок, поселок, деревня (нужное — подчеркнуть)
улица пр-т переулок *(нужное — подчеркнуть)*
дом *а,б,в,г* корп. кв.

(Примечание: в случае получения газеты через абонентский ящик обязательно укажите индекс и адрес почтового отделения)

Мы думалі: калі падчас прэс-канферэнцыі А.Лукашэнка на ўвесь свет сказаў, што ён не супраць таго, каб "Народная воля" друкавалася ў Мінску, — так яно і будзе.

На жаль, пакуль не спраўдзіліся нашы спадзяванні. Як і Вашы, шаноўныя чытачы.

А таму будаваць планы на наступны, 2008 год, мы вымушаны ў экстрэмальных умовах. Да таго часу, пакуль газета будзе друкавацца ў Смаленску, змяніць перыядычнасць выхаду нумароў не ўяўляецца магчымым, як і зрабіць **перадаплату** больш таннай. Безупынна растуць выдаткі на паперу, паліграфічныя паслугі, транспарт, сувязь... У той жа час разумеем: не кожны з нашых чытачоў здольны адгукнуцца на дадатковыя расходы. Таму шчыра скажам: мы, разыкуючы, не павышаем кошт нумароў па **перадаплаце** ў 2008 годзе. Тарыфы ранейшыя: на месяц — 9500 рублёў для індывідуальных чытачоў і 15.000 рублёў для арганізацый, прадпрыемстваў, устаноў, фірм. Пры гэтым заўважым: кошт газеты пры рэалізацыі ў розніцу вымушаны будзем падняць.

Да Вас, паважаныя сябры, ёсць адна вялікая просьба: не адкладвайце з **перадаплатай** за нумары першай паловы 2008 года на апошнія дні. Асобна звяртаемся да тых, хто да гэтага часу не заплаціў за лістапад і снежань. Калі ласка, пастарайцеся вырашыць усе пытанні ў бліжэйшыя дні. Для гэтага ў чарговы раз наведайце любы філіял "Беларусбанка", а там, дзе іх няма, — любое паштовае аддзяленне.

Паўтараем: мінчане могуць аператыўна зрабіць **перадаплату** праз рэдакцыйны офіс (вул.Энгельса, 34а) альбо пазваніць па тэлефонах: 206-63-93 ці 206-68-71. Пасля званка да Вас прыйдуць нашы валанцёры са свежымі нумарамі газеты і дапамогуць аформіць **перадаплату** за любы тэрмін.

Банкаўскія рэквізіты "Народнай волі" такія:

УП "Народная воля": р/р 3012006535014, ААТ "Пріорбанк", ЦБП 113, код 749, УНН 100961759.

Вымушаны і на гэты раз звярнуць увагу на тое, што перасылаць у рэдакцыю трэба не толькі копію плацежнага дакумента, але і запоўненую **АБАНЕНЦКУЮ КАРТКУ,** узор якой друкуем і ў сённяшнім нумары.

Зноў жа: запаўняйце выразна, пажадана друкаванымі літарамі. Разумеем: для тых, хто рабіць гэта будзе ўпершыню, не вельмі прыемная рэч. Але што зробіш: каб своечасова атрымліваць газету, мы вымушаны звяртацца з такой просьбай.

Вы — з «Народнай воляй», «Народная воля» — з Вамі!

Адрас рэдакцыі:
220030, Мінск, вул.Энгельса, 34а.
Прыёмная: тэл./факс (017) 206-68-71.
Тэл./факс рэкламнага аддзела: 206-69-04, 206-69-06.
E-mail : nv@promedia.by
http://www.nv-online.info

Індэкс 63222

Заснавальнік і галоўны рэдактар Іосіф СЯРЭДЗІЧ

У сувязі з адсутнасцю магчымасці рэдакцыя матэрыялы не рэцэнзуе і не вяртае, права ўступлення ў перапіску пакідае за сабой. За інфармацыю, размешчаную ў рэкламных аб'явах, рэдакцыя не адказвае. Могуць друкавацца матэрыялы, у якіх пазіцыя аўтараў не падзяляецца газетай.
Пасведчанне аб рэгістрацыі перыядычнага выдання №246 ад 10 кастрычніка 1996 г. (пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі №224 ад 6 сакавіка 2000 г.).
Надрукавана ў ТАА "Типография Михайлова - С", 214020, г.Смаленск, вул. Шаўчэнкі, 86. Па заказе ТАА "Типография Михайлова", 214000, г.Смаленск, вул. Кастрычніцкай рэвалюцыі, д.38, кв.54. Падпісаны ў друк 07.11.2007 у 16.00. Аб'ём 4 друк. аркушы. Тыраж: 11 000 экз. Заказ №